Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

2 ЖНІЎНЯ 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 144 (29011)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

+TV ПРАГРАМА

У ШКОЛУ — З ДОБРЫМ СЭРЦАМ 3

НЕ КАНКУРЭНЦЫЯ, А КААПЕРАЦЫЯ МС

ЛІЧБА ДНЯ

З 52 працэнтаў

плошчаў сабраныя збожжавыя і зернебабовыя культуры (без кукурузы, грэчкі і проса) у гаспадарках краіны па стане на 1 жніўня. У засекі пакладзена ўжо 3 мільёны 639 тысяч тон збожжа. У лідарах Брэсцкая вобласць. Тут убрана больш за 80 % плошчаў, намалочана больш як 1 млн тон збожжа. Аграрыі Гродзенскай вобласці сабралі 60 %, намалаціўшы пры гэтым 759 тысяч тон збажыны. У тройцы лідараў уборачнай кампаніі таксама Гомельская вобласць. Тут план па ўборцы збожжавых і зернебабовых выкананы больш чым на 53 %, намалот склаў 403 тысячы тон. Усяго сёлета пад збожжавыя і зернебабовыя культуры (без уліку кукурузы, грэчкі і проса) адведзена 2 мільёны 162 тысячы гектараў.

КАРАТКА

- **МУС прапаноўвае павялічыць пакаранне за гандаль дзецьмі да 20 гадоў пазбаўлення волі.**
- Тарыф на транспарціроўку газу па размеркавальных трубаправодах ДВА «Белпалівагаз» павялічаны на 18,7 %.
- **Індывідуальныя прадпрымальнікі ў першым паўгоддзі заплацілі Br282,5 млн падаткаў.**
- Агульная аўдыторыя II Еўрапейскіх гульняў у сацыяльных сетках склала больш за 812 мільёнаў гледачоў.
- **У Мінску ў I паўгоддзі ўвялі ў эксплуатацыю 26 шматкватэрных жылых дамоў.**
- У Брэсце шукаюць веласіпедыста, які збіў трохгадовае дзіця.

ISSN 1990 - 763X

Фота БелТА.

СТАСУНКІ З АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАМІ

Прэзідэнт Узбекістана ўпершыню наведаў Беларусь з афіцыйным візітам

Напярэдадні перагавораў Шаўкат Мірзіёеў па запрашэнні Аляксандра Лукашэнкі наведаў дзяржаўную рэзідэнцыю «Заслаўе». Прэзідэнты прагуляліся па яе тэрыторыі, а затым абмяняліся падарункамі.

Прэзідэнты таксама пагутарылі ў нефармальнай абстаноўцы. Прычым месцам сустрэчы была абраная разьбяная альтанка, якую Шаўкат Мірзіёеў падарыў Аляксандру Лукашэнку летась пасля яго афіцыйнага візіту ва Узбекістан. Падчас гутаркі кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі знешнепалітычныя становішчы сваіх краін і адшукалі падобныя тэндэнцыі: Узбекістан знаходзіцца ў цэнтры Цэнтральнай Азіі, Беларусь — у цэнтры Еўропы, з чым звязаныя і аднолькавыя перавагі, і аднолькавыя праблемы.

СТАР. 2

МАГУТНЫ І ЎНІКАЛЬНЫ

Завяршаюцца будаўніча-мантажныя работы на ўнікальным для нафтавай галіны Беларусі аб'екце — комплексе запаволенага каксавання ААТ «Нафтан». Увод яго ў эксплуатацыю дазволіць павялічыць глыбіню перапрацоўкі нафты да 90 % і выхад светлых нафтапрадуктаў да 65 %, а таксама наладзіць выпуск новых нафтапрадуктаў.

На здымку: інжынеры аддзела генплана ААТ «Нафтан» браты Андрэй і Юрый ЯНУЛЁНКІ.

Фота БелТА.

Леанід ЗАЯЦ:

«НАШ АГУЛЬНЫ БЕЛАРУСКІ ДОМ АТРЫМАЙСЯ МОЦНЫ, І ЗА ЯГО НЕ СОРАМНА ПЕРАД СУСЕДЗЯМІ»

ЧВЭРЦЬ 25 СТАГОДДЗЯ

Першым госцем нашай рубрыкі стаў губернатар Мінскай вобласці Анатоль Ісачанка. Ён раскажа, якія перамены адбыліся за апошнія 25 гадоў на прыкладзе цэнтральнага рэгіёна Беларусі. Сёння мы звяртаем наш позірк на ўсход, туды, дзе знаходзіцца Магілёўская вобласць. Яна значна пацярпела ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, але змагла пераадолець звязаныя з гэтым цяжкасці і сёння дынамічна развіваецца. Больш падрабязна пра становішча гэтага рэгіёна і яго дасягненні — у размове са старшынёй Магілёўскага аблвыканкама Леанідам Зайцам.

СТАР. 4–5

СТАСУНКІ З АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАМІ

Дарога адкрытая

«За два гады мы зрабілі больш, чым у папярэднія дваццаць пяць», — выказаў меркаванне Прэзідэнт Беларусі на наступны дзень падчас сустрэчы ў вузкім складзе.

Прэзідэнты дамовіліся аб рэгулярным абмене візітамі і кантролі ажыццяўлення плану развіцця двухбаковых адносін. Сёння Аляксандр Лукашэнка прапанаваў не толькі шчыра абмеркаваць поспехі ў рэалізацыі мерапрыемстваў дарожнай карты, але і вызначыць пытанні, над якімі трэба працаваць.

«Хачу, каб вы ведалі, яшчэ раз падкрэсліваю: няма закрытых тэм у Беларусі, няма пытанняў, якія мы не маглі б вырашыць. Мы можам рашыць любыя пытанні. Нашы эканомікі не перасякаюцца, мы ўзаемадапаўняльныя. Усё, што мы вырабляем, патрэбна ва Узбекістане, усё, што вы вырабляеце, патрэбна нам», — перакананы Аляксандр Лукашэнка.

Ён паведаміў пра гатоўнасць Беларусі далучыцца да прамысловай і сельскагаспадарчай рэвалюцыі, якую пачаў Узбекістан. Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены: Беларусь там будзе не лішняя і ў гэтай рэвалюцыі знойдзе сваё месца.

Шаўкат Мірзіёеў згадзіўся, што ўсё зробленае за чвэрць стагоддзя набыло новае напаўненне ва ўсіх сферах пасля гістарычнага візіту Аляксандра Лукашэнкі ва Узбекістан. Гэта адчуваюць абодва народы, адзначыў Прэзідэнт Узбекістана.

Ён асобна падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за адкрыццё помніка Алішэру Наваі ў Мінску. «Гэта вялікая падзея для ўзбекскага народа», — падкрэсліў высокі госць.

Больш, чым сяброўства

«Беларусь і Узбекістан заўсёды звязвала нешта большае за проста сяброўскія адносіны — сімпатыя, заснаваная на ўласцівых нашым народам працавітасці, любові да зямлі, імкненні да міру і стварэння. Пра гэтыя каштоўнасці казаў Прэзідэнт падчас нарады ў вузкім складзе», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка, пачынаючы афіцыйныя перагаворы з Шаўкатам Мірзіёевым у пашыраным складзе.

У насычаным парадку дня шмат спадарожных мерапрыемстваў, звязаных з візітам, — першы ў гісторыі Форум рэгіёнаў па прапанове Шаўката Мірзіёева, Дні ўзбекскай культуры, нацыянальная выстаўка краіны. Такая разнапланавая праграма — яркае пацвярджэнне ўзаемнага імкнення да рознабаковага развіцця дыялогу. Кіраўнік Беларусі лічыць, што пашырэнне прамых эканамічных і гуманітарных кантактаў паміж абласцямі, прадпрыемствамі, грамадзянамі забяспечыць якаснае ўмацаванне міждзяржаўных сувязяў.

За гады незалежнасці Узбекістан зрабіў якасны прарыў у дыверсіфікацыі нацыянальнай эканомікі, стварыў новыя галіны: аўтамабілебудаванне, нафтагазахімію, вытворчасць сельгастэхнікі.

«Беларусь гатова пашыраць супрацоўніцтва з Узбекістанам па эканамічным кірунку, у тым ліку шляхам рэалізацыі сумесных інвестыцыйных праектаў», — паведаміў Аляксандр Лукашэнка.

У апошнія гады тавараабарот паміж нашымі краінамі значна павялічыўся. Аднак наш Прэзідэнт перакананы: дасягнуты ўзровень усё яшчэ не адпавядае наяўнаму патэнцыялу, аб'ёмы гандлю можна значна павялічыць.

Рост тавараабароту актуальны не толькі для беларускага экспарту, але і для імпартных паставак з Узбекістана, бо попыт на ўзбекскае бавоўнянае валакно, пражу, садавіну і іншыя тавары ў Беларусі вельмі высокі.

Прынцыпова важным застаецца пытанне эфектыўнай рэалізацыі беларуска-ўзбекскіх праектаў. Пакуль не ўсе прапановы, якія абмяркоўваліся ў Ташкенце, удалося ажыццявіць. У нечым гэта і натуральна, таму і праводзяцца перагаворы па чарзе штогод у Мінску і Ташкенце.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Далей за межы

Летась краіны дамовіліся стварыць некалькі малочнатаварных комплексаў з прыцягненнем беларускіх праектных і будаўнічых арганізацый, планавалася ўкамплектаваць іх беларускай тэхнікай.

«Вельмі б хацелася, каб гэтыя праекты былі завершаныя. Трэба пабудаваць перапрацоўчае малочнае прадпрыемства, каб мы маглі гандляваць не толькі ва Узбекістане, але і ў суседзяў, у прыватнасці ў Афганістане», — беларускі лідар папрасіў падтрымкі ўзбекскага калегі ў вырашэнні пытання з фінансаваннем праектаў.

Беларускі бок падрыхтаваў план-графік паставак на Узбекістан 1500 галоў буйной рагатай жывёлы ў 2019—2020 гадах.

«Ні на якую Еўропу не арыентуемся, мы пабудуем гэтыя комплексы і забяспечым уласнай жывёлай, каб было потым у каго спытаць пра вынік», — запэўніў Аляксандр Лукашэнка.

Ён з задавальненнем адзначыў інтэнсіўнае супрацоўніцтва ў галіне фармацэўтыкі. Цяпер рэалізуюцца тры сумесныя праекты на тэрыторыі Узбекістана: вытворчасць камплектаў дыялізатараў і дыялізных магістраляў для хворых на нырачную недастатковасць, выпуск антыбіётыкаў, а таксама антысептычных і дэзінфіцыруючых сродкаў.

У гэтай сферы прапрацоўваецца пытанне стварэння адзінай вытворчай пляцоўкі холдынга «Белфармпрам» ва Узбекістане з магчымасцю выхаду на рынкі трэціх краін.

Яшчэ адной перспектыўнай сферай узаемадзеяння Прэзідэнт лічыць лёгкую прамысловасць. Беларусь традыцыйна закупляе значныя аб'ёмы ўзбекскай бавоўнянай тканіны, трыкатажнага палатна, вопраткі. Аднак і беларускія прадпрыемствы могуць экспартаваць штучныя тканіны, трыкатаж, гарсэтныя і панчошна-шкарпэтачныя вырабы.

«Нашы фабрыкі пастаўляюць тканіну і тэкстыльную галантарэю для сілавых структур дзяржаў СНД. Мы зацікаўлены ў гэтым плане наладзіць больш цеснае ўзаемадзеянне з Узбекістанам», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, дадаўшы, што работа па арганізацыі на ўзбекскай тэрыторыі выпуску абутку і футра з аўчыны холдынгам «Марка» ідзе добрымі тэмпамі.

У Беларусі актыўна развіваецца IT-сектар, ствараюцца інфармацыйныя сістэмы ў сферах дзяржаўнага кіравання, транспарту, фінансава-крэдытнай дзейнасці. Айчынныя кампаніі даказалі сваю канкурэнтаздольнасць на сусветным рынку.

«Калі будзе падтрымка праектаў па ўкараненні аўтаматызаванай сістэмы ўліку прыроднага газу з выкарыстаннем беларускага праграмнага забеспячэння і лічыльнікаў газу, па мадэрнізацыі і аўтаматызацыі газаразмеркавальнай і газатранспартнай сетак, мы гатовыя пачаць іх практычную прапрацоўку», — звярнуўся да ўзбекскай дэлегацыі беларускі Прэзідэнт.

Партнёрства — стратэгічнае

Падчас перагавораў прэзідэнты Беларусі і Узбекістана абмеркавалі выкананне дамоўленасцяў і намецілі перспектывы далейшага двухбаковага супрацоўніцтва. Гэта адзначыў на сустрэчы са СМІ Аляксандр Лукашэнка.

«За няпоўны год, які прайшоў з моманту майго візіту ва Узбекістан, дасягнуты заўважны прагрэс ва ўмацаванні адносін паміж нашымі краінамі. Гэтаму спрыяў сістэмны міждзяржаўны дыялог, у тым ліку на найвышэйшым узроўні. Я вельмі цаню даверную атмасферу сустрэч з Шаўкатам Мірамонавічам, на якіх шчыра і канструктыўна абмяркоўваюцца ўсе кірункі, што прадстаўляюць узаемную цікавасць. Такімі былі і гэтыя перагаворы», — паведаміў Прэзідэнт.

Кіраўнікі дзяржаў адзначылі важнасць пашырэння кантактаў паміж рэгіёнамі дзвюх краін. Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што І Форум рэгіёнаў Беларусі і Узбекістана надасць дадатковы імпульс гэтаму працэсу і стане эфектыўнай пляцоўкай для нарошчвання супрацоўніцтва ў сферы інвестыцый.

Паступова развіваецца і дыялог у гуманітарнай галіне. Летась паспяхова прайшлі Дні культуры Беларусі ва Узбекістане, а напярэдадні візіту Шаўката Мірзіёева ў Беларусі сваё майстэрства прадставілі ўзбекскія майстры мастацтваў.

У сферы навукі і адукацыі бачны значны патэнцыял для абмену досведам, навучэння і стажыровак спецыялістаў, рэалізацыі сумесных праектаў.

Акрамя таго, прэзідэнты абмеркавалі актуальныя пытанні рэгіянальнага і глабальнага характару, намецілі перспектывы сумеснай работы ў рамках Садружнасці Незалежных Дзяржаў, пацвердзілі гатоўнасць умацоўваць партнёрства ў барацьбе з тэрарызмам, экстрэмізмам, кантрабандай наркотыкаў, іншымі выклікамі і пагрозамі сучаснасці.

У Палацы Незалежнасці падпісаны пакет пагадненняў, закліканых істотна ўмацаваць супрацоўніцтва — перш за ўсё дзелавое і рэгіянальнае, а таксама пашырыць магчымасці ўзаемадзеяння ў сферах інвестыцый, інфармацыі, адукацыі і аховы навакольнага асяроддзя. Падпісалі сумесную заяву і прэзідэнты.

Аляксандр Лукашэнка высока ацаніў вынікі афіцыйных перагавораў, якія мелі дзелавы і канструктыўны характар і чарговы раз пацвердзілі: Беларусь і Узбекістан з'яўляюцца стратэгічнымі партнёрамі і маюць намер працягваць курс на ўмацаванне супрацоўніцтва.

«Мне абсалютна блізкія і зразумелыя дзеянні Прэзідэнта Узбекістана, каб узняць краіну, каб народ Узбекістана паверыў, што гэта не толькі старажытная нацыя, але і вельмі перспектыўная, — прызнаўся Прэзідэнт Беларусі. — Я выказаўся, што ўлада Узбекістана робіць «рэвалюцыю» ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы: яна не проста мадэрнізуе краіну, галіны эканомікі — яна стварае прынцыпова новыя кірункі жыцця».

На новым этапе жыцця патрэбныя новыя тэхналогіі, прычым на першае месца выходзяць іх якасць, кошт і адказнасць тых, хто прапануе гэтыя тэхналогіі. Узбекістан свой выбар зрабіў на карысць Беларусі.

«Я паабяцаў, што мы ніколі яго не падвядзём і што ён ніколі не пашкадуе, што звязаўся з Беларуссю. Мы прапанавалі кошт-якасць і найвышэйшую адказнасць, і мы гэта павінны зрабіць. Каб мой сябра — мой брат, як мы адзін аднаго называем, — праз колькі гадоў не пашкадаваў», — звярнуўся кіраўнік дзяржавы да беларускай часткі перагавораўшыкаў.

Ён упэўнены, што калега з яго досведам і рашучасцю здолее зрабіць Узбекістан квітнеючай краінай. Шаўкат Мірзіёеў, у сваю чаргу, адзначыў, што Беларусь, якая мірна і стабільна развіваецца, — прыклад для шматлікіх краін.

«Шляху назад няма. Мы павінны ажыццяўляць усё, пра што дамовіліся», — падкрэсліў Прэзідэнт Узбекістана. Ён паведаміў, што падчас Форуму рэгіёнаў і нацыянальнай выстаўкі падпісаныя кантракты і пагадненні на суму каля трохсот мільёнаў долараў, што сведчыць пра шырокія магчымасці для нарошчвання партнёрства паміж рэгіёнамі.

Шаўкат Мірзіёеў запрасіў Аляксандра Лукашэнку наведаць Узбекістан з афіцыйным візітам у любы зручны час. Прэзідэнт Узбекістана пасадзіў дрэва ў Алеі пачэсных гасцей. У традыцыйнай для першых візітаў кіраўнікоў замежных дзяржаў цырымоніі ўдзельнічаў і беларускі лідар.

«Зроблена ва Узбекістане»

Такую назву атрымала выстаўка нацыянальнай прадукцыі гэтай краіны Цэнтральнай Азіі, якая адкрылася ў Мінску 29 ліпеня напярэдадні афіцыйнага візіту Шаўката Мірзіёева. Учора, у перадапошні дзень яе работы, выставачны комплекс «БелЭкспа» наведалі прэзідэнты Беларусі і Узбекістана.

80 прадпрыемстваў, 15 тэматычных раздзелаў (машынабудаўнічая, нафтагазавая, хімічная, фармацэўтычная, будаўнічая, тэкстыльная, інфармацыйная галіны, харчовая прамысловасць, сельская гаспадарка і іншыя), 12 адзінак узбекскай аўтамабільнай тэхнікі, 10 рэгіянальных экспазіцый — гэта асноўныя лічбы выстаўкі. Увогуле арганізатары мерапрыемства, як і лідары краін падчас перагавораў, асноўны акцэнт зрабілі на рэгіянальным супрацоўніцтве. Сваю прадукцыю прадставілі Андзіжанская, Бухарская, Джызакская, Наваійская, Наманганская, Самаркандская, Ташкенцкая, Сырдар'інская, Ферганская, Харэзмская вобласці Узбекістана.

З ініцыятывы Прэзідэнта ў Джызакскай вобласці Узбекістана цяпер рэалізуецца праграма «Перадавы рэгіён». На стэндзе гэтай вобласці прадстаўлена прадукцыя, створаная ў выніку праекта і ў рамках свабоднай эканамічнай зоны. Джызакская вобласць Узбекістана сёння мае актыўныя зносіны з Магілёўшчынай. Дапамог умацаваць сувязі і І Форум рэгіёнаў, які адбыўся напярэдадні. Напрыклад, Заамінскі раён Джызакскай вобласці падпісаў пагадненне са Шклоўскім раёнам. Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся: якія сумесныя вектары супрацоўніцтва знайшлі партнёры? Сярод іх, па словах прадстаўніка рэгіёна, — сельская гаспадарка, машынабудаванне, перапрацоўка мяса-малочнай прадукцыі.

Расказалі ўзбекскія спецыялісты пра развіццё інфармацыйнага сектара. Так, прэферэнцыі і льготы ў IT-парку Узбекістана аналагічныя тым, што існуюць у беларускім ПВТ.

Прадставілі прамыслоўцы з Узбекістана Прэзідэнту Беларусі свае дасягненні ў аўтамабілебудаванні — легкавыя і грузавыя машыны, гарадскі аўтобус, седлавыя цягачы і паўпрычэпы. Лакалізацыя некаторых мадэляў легкавых аўто складае ад 65 да 82 %. Ганарацца вытворцы і выдатнымі суадносінамі «кошт-якасць». Менавіта даступная цана дазволіць выйсці на рынкі іншых краін. У планах узбекскіх машынабудаўнікоў павялічыць выпуск аўтамабіляў да 250 тысяч у год.

Выстаўка «Зроблена ва Узбекістане» арганізавана Міністэрствам інвестыцый і знешняга гандлю і Міністэрствам эканомікі і прамысловасці Узбекістана пры падтрымцы Беларускай гандлёва-прамысловай палаты.

Марыя ДАДАЛКА.
Варвара МАРОЗАВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У ЗША ўпершыню за 10 гадоў панізілі базавую стаўку

Федэральная рэзервовая сістэма ЗША (выконвае функцыю цэнтрабанка краіны) панізіла базавую стаўку на 25 пунктаў — да 2—2,25 працэнта гадавых. Апошні раз падобная мера ўжывалася ў перыяд Вялікай рэцэсіі 2008 года. Зніжэнне базавай стаўкі — рызыкоўны крок, які да гэтага часу было прынята рабіць толькі ў крайнім выпадку, калі эканамічнаму развіццю перашкаджаюць сапраўды сур'ёзныя праблемы. Небяспека нізкай стаўкі заключаецца ў тым, што яна, апроч іншага, спрыяе раздзіманню фінансавых «бурбалак».

Невялікае зніжэнне ключавой стаўкі на чвэрць пункта павінна стаць прафілактычнай мерай ва ўмовах глабальных эканамічных выклікаў, такіх як гандлёвая вайна ЗША з Кітаем і выхад Вялікабрытаніі з Еўрасаюза. Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп раскрытыкаваў рашэнне ФРС, назваўшы яго недастатковым, і абвінаваціў у гэтым кіраўніка рэгулятара Джэрама Паўэла. Дзеянні ФРС былі чаканыя, тым не менш амерыканскія фондавыя індэксы пачалі зніжацца.

Расію і Кітай звяжа канатная дарога

У Благавешчанску пачаліся работы па будаўніцтве канатнай дарогі паміж Расіяй і Кітаем цераз раку Амур. Плануецца, што падвесная траса працягласцю 973 метры звяжа гарады Благавешчанск і Хэйхэ. Інжынеры нідэрландскага канструктарскага бюро UNStudio, адказнага за будаўніцтва, абяцаюць, што час шляху паміж двума тэрміналамі складзе тры з паловай хвіліны. Мяркуецца, што канатная дарога будзе складацца з дзвюх ліній, па кожнай з якіх будуць хадзіць чатыры кабіны ўмяшчальнасцю 60 чалавек. Улады Амурскай вобласці паведамілі, што транспарт зможа перавозіць 6-7 тысяч пасажыраў у дзень, а штогадовы пасажырапаток да 2024 года дасягне мільёна чалавек.

Краіны вычарпалі сёлетнія аднаўляльныя рэсурсы планеты

У свеце сёлета ўжо вычарпаны аб'ём рэсурсаў, які планета можа аднавіць за год. Чалавецтва пачало жыць «у доўг». Пра гэта паведаміў канал CNN са спасылкай на вынікі даследавання аналітычнага цэнтра Global Footprint Network. З кожным годам сусветны дзень экалагічнага доўгу надыходзіць усё раней і раней: у 2000 годзе гэты рубеж быў пройдзены ў пачатку кастрычніка, у 2013-м — 20 жніўня.

Сёлета дзень экалагічнага доўгу надышоў на два месяцы раней меркаванага тэрміну, гэта самая ранняя дата за апошнія 20 гадоў. Чалавецтва цяпер выкарыстоўвае прыроду ў 1,75 раза хутчэй, чым аднаўляюцца экасістэмы нашай планеты, патлумачыла экалагічная група, якая знаходзіцца ў ЗША ў штаце Каліфорнія. «У нас ёсць толькі адна Зямля — гэта вызначальны кантэкст чалавечага існавання. Мы не можам выкарыстоўваць 1,75 планеты без разбуральных наступстваў», — адзначыў заснавальнік аналітычнага цэнтра Global Footprint Network Матыс Вакернагель. Глабальны перарасход выяўляецца ў выглядзе знікнення лясоў, эрозіі глебы, страты біялагічнай разнастайнасці. Усё гэта прыводзіць да змены клімату і да экстрэмальных умоў надвор'я.

«У ШКОЛУ З ДОБРЫМ СЭРЦАМ»

БРСМ даў старт рэспубліканскай дабрачыннай акцыі. Яе мерапрыемствы пройдуць да 10 верасня ва ўсіх рэгіёнах краіны і сталіцы.

Акцыя «Добрае Сэрца» ў Гомелі. Фота БелТА.

Задача акцыі — пры падрыхтоўцы дзяцей-школьнікаў да новага навучальнага года аказаць адрасную сацыяльную падтрымку сем'ям, якія трапілі ў складаную жыццёвую сітуацыю і перажываюць цяжкасці, а таксама дзіцячым інтэрнатным установам.

Валанцёры руху БРСМ «Добрае Сэрца» арганізуюць у буйных гандлёвых цэнтрах краіны пункты збору канцылярскіх і спартыўных прылад, тавараў для дзіцячай творчасці, развівальных настольных гульняў, навучальных дапаможнікаў, школьнага адзення, абутку і г. д.

Гэтыя падарункі будуць уручаны дзецям са шматдзетных і няпоўных сем'яў, а таксама дастаўлены ў дзіцячыя дамы, сацыяльныя прытулкі, цэнтры карэкцыйна-развівальнага навучання.

У першы дзень акцыі «У школу з Добрым Сэрцам» мерапрыемствы прайшлі ў абласных цэнтрах, буйных гарадах Міншчыны і сталіцы, затым маладзёжны пачын падхопяць усе рэгіёны.

Так, 1 жніўня скарбонкі «Добрага Сэрца» па зборы школьных прылад былі ўстаноўлены ў гандлёва-забаўляльных цэнтрах «Экватар» у Брэсце і «Е-сіці» ў Магілёве, крамах «Еўраопт» па праспекце Машэрава ў Віцебску, «Панарама» ў Гомелі, падчас работы школьнага кірмашу на ўнутранай паркоўцы ГЦ OldCity ў Гродне, гіпермаркеце Green у Салігорску, на пляцоўках каля кнігарні «Спадчына» ў Маладзечне, гарадскога Дома культуры ў Дзяржынску. У сталіцы ў гэты дзень неабыякавых мінчан і гасцей Мінска валанцёры чакалі каля ўнівермага «Беларусь», Гандлёвага дома «На Нямізе» і ў ГЦ «Гіпа» па праспекце Ракасоўскага.

Падчас акцыі «У школу з Добрым Сэрцам» добраахвотнікі БРСМ прымуць удзел у працоўных дэсантах, а зароблены грашовы сродкі накіруюць на набыццё школьных прылад. Таксама добраахвотнікі Саюза моладзі арганізуюць канцэртныя і гульнявыя праграмы ў дзіцячых інтэрнатных установах з уручэннем сабраных падарункаў.

Упершыню пры падтрымцы зацікаўленых у рамках акцыі будзе арганізавана бясплатнае прававое кансультаванне цяжкіх падлеткаў ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі і школах-інтэрнатах, дзяцей, якія трапілі ў складаныя жыццёвыя сітуацыі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЗАДАЦЬ ПЫТАННЕ І АТРЫМАЦЬ АДКАЗ

Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца ў суботу, 3 жніўня. На званкі з 9.00 да 12.00 будуць адказваць:

першы намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Андрэй Анатолевіч КЛЕЦ. Тэл. 8 016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Барыс Сяргеевіч ЯФРЭМАЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ПРЫВАЛАЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;

кіраўнік спраў ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Ігар Андрэевіч ПАПОЎ. Тэл. 8 015 273 56 44;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Андрэй Міхайлавіч КУНЦЭВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;

кіраўнік спраў МІНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ГУРЫНОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

кіраўнік спраў МІНСКАГА гарвыканкама Ганна Мар'янаўна МАЦЕЛЬСКАЯ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Надвор'е

ВЕРАСЕНЬ ЗАМАЎЛЯЛІ?

Жнівень пакуль стартуе прахалодным надвор'ем. Прычына гэтага — магутны цыклон, цэнтр якога знаходзіцца ажно каля Паўднёвага Урала. Ён і зацягвае да нас паветраныя масы з поўначы Еўропы. Але цяпер да прахалоды дададуцца і дажджы. Падрабязней пра надвор'е на канец тыдня расказалі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У пятніцу ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі. Прычына іх — атмасферныя франты. У разгар дня паветра прагрэецца максімум да 15—21 градуса цяпла.

Выхадныя пачнуцца прыкладна з такой жа тэмпературы паветра, а вось дажджоў у суботу чакаецца ўжо меней. Праўда, і ноччу не вельмі цёпла — усяго 7—13 градусаў. А вось у нядзелю да нас зноў завітаюць атмасферныя франты з ранейшым наборам — ападкамі ў многіх раёнах краіны і яшчэ больш халодным паветрам — па поўначы Беларусі днём чакаецца ўсяго толькі 13 градусаў! Праўда, на поўдні будзе да плюс дваццаці трох. А раніцай у суботу і нядзелю згусцяцца першыя туманы.

Па папярэдніх прагнозах, у панядзелак таксама чакаюцца дажджы. Уначы — зусім не жніўеньскія плюс 5—12. Ды і ўдзень не надта цёпла — плюс 12—19. Вось так да нас зусім не па графіку прыйшло вераснёўскае надвор'е...

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Дажынкі-2019

Барысаў годна прыме свята

Барысаў актыўна рыхтуецца да абласнога свята-фестывалю працаўнікоў вёскі «Дажынкі», якое будзе прымаць восенню. Горад, можна сказаць, ператварыўся ў суцэльную будаўнічую пляцоўку.

У выніку рамонту літаральна на вачах мяняюцца будынкі цэнтральнай раённай бібліятэкі імя І. Х. Каладзеева, дзіцячай музычнай школы, Палаца культуры імя М. Горкага. Ва ўстановах аховы здароўя раёна таксама праходзяць мерапрыемствы па добраўпарадкаванні і навядзенні парадку, набываецца сучаснае абсталяванне. Напрыклад, у верасні тут з'явіцца камп'ютарны тамограф і ангіяграфічны комплекс.

Адной з асноўных будоўляў была і застаецца рэканструкцыя вуліцы Гагарына, а менавіта аўтадарогі Р53 (Слабада — Навасады). Работы тут вядуцца ў восем этапаў. Першыя змены жыхары Барысава ўжо ацанілі. Галоўная магістраль горада пашырылася да шасці палос для руху транспарту, з'явіліся пешаходныя тратуары, веладарожкі, добраўпарадкаваная зялёная зона.

Паэтапна праводзіцца комплекснае добраўпарадкаванне дарог, вуліц, дваровых тэрыторый з заменай інжынерных камунікацый. Нельга ахапіць усё адразу, таму акцэнт робіцца ў першую чаргу на дварыы шматпавярховых жылых дамоў у цэнтры Барысава. Мяркуецца ўладкаваць 13 дзіцячых гульнявых пляцовак, 200 лавак і столькі ж ёмістасцяў для смецця. Таксама запланаваны бягучы рамонт асфальтабетоннага пакрыцця праезджай. Шмат увагі надаецца азеляненню.

Стане больш прывабны і будынак кінатэатра «Перамога». На яго базе адкрыецца шматфункцыянальны цэнтр. Сюды пераедзе аддзел ЗАГС, але ў абноўленай «Перамозе» застануцца ўсе гуртки, якія дзейнічаюць цяпер.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Ну і ну

ПРЫЕХАЎ СА ЗБРОЯЙ...

Канфіскацыя аўтамабіля і штраф у памеры 300 базавых велічынь — так быў пакараны расіянін, які прыехаў у Магілёў да свайкоў жонкі з... пісталетам і патронамі.

— У Расіі дазволена захаванне і нашэнне агнястрэльнай зброі траўматычнага дзеяння, а ў Беларусі — не. Але госць пра гэта не ведаў і з пісталетам у сумцы пайшоў у Магілёве на плошчу Славы адзначаць свята. Пры асабістым даглядзе ён прад'явіў пісталет супрацоўнікам АМАП і адразу ж быў затрыманы, — паведаміла **старшы памочнік пракурора Магілёва Марыя ІВУЦІНА.**

У дачыненні да расіяніна былі распачатыя адразу дзве крымінальныя справы — за незаконнае перамяшчэнне праз дзяржаўную мяжу Рэспублікі Беларусь агнястрэльнай зброі і за яе незаконнае захаванне, перавозку і нашэнне. З улікам выключных абставін яму прызначана пакаранне ў выглядзе штрафу ў памеры 300 базавых велічынь і канфіскацыі аўтамабіля, на якім ён прывёз пісталет, — па законе гэта сродак здзяйснення злачынства.

Абвінавачаны не пагадзіўся з канфіскацыяй аўто і абскардзіў рашэнне суда. Аднак судовая калегія па крымінальных справах Магілёўскага абласнога суда прысуд першай інстанцыі пакінула без змены, ён ужо ўступіў у законную сілу.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Рэдкая знаходка

Зэльвенскі рарытэт

Этнолагі БДУ знайшлі на Гродзеншчыне рарытэтнае Евангелле ўзростам каля 300 гадоў. Кніга трапіла ў поле іх зроку падчас этнаграфічнай практыкі студэнтаў гістарычнага факультэта.

Уладальнікам рарытэта з'яўляецца старажыл Зэльвенскага раёна Аляксандр Калюта. Евангелле перадаецца ў сям'і як рэліквія ад бацькі да сына на працягу больш чым пяці пакаленняў. Па словах Аляксандра Калюты, узрост кнігі можа дасягаць 300 гадоў. Сапраўдны пераплёт выдання не захаваўся. Устанавіць дакладны ўзрост старадрукаванага Евангелля трэба будзе навукоўцам гістарычнага факультэта БДУ. Яны таксама вызначаць унікальнасць асобніка.

Звычайна падобныя выданні можна сустрэць у фондах музеяў, у цэрквах ці прыватных калекцыях. Таму такая знаходка сярод мясцовых жыхароў можа аказацца каштоўным артэфактам. Напрыклад, у 2016 годзе ў рамках этнаграфічнай практыкі студэнтаў гістарычнага факультэта БДУ быў знойдзены абраз Святой вялікамучаніцы Варвары, які датуецца другой паловай XIX стагоддзя. Абраз належаў жыхарцы Барысаўскага раёна, якая і перадала яго ўдзельнікам экспедыцыі. Гісторыкамі была праведзена атрыбуцыя, пасля чаго абраз папоўніў фонд Нацыянальнага гістарычнага музея.

Сёлета этнаграфічныя даследаванні студэнтаў БДУ прайшлі ў дзесяці населеных пунктах Зэльвенскага раёна. Усяго на працягу трох тыдняў было апытана больш за 60 пажылых людзей. Падобныя экспедыцыі праводзяцца, каб зафіксаваць маўленчыя асаблівасці карэнных жыхароў, устанавіць мясцовыя адметнасці, вывучыць традыцыі і абрады, выявіць новыя гістарычныя крыніцы. Усе атрыманыя матэрыялы апрацоўваюцца і публікуюцца для далейшага іх выкарыстання фалькларыстамі і лінгвістамі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении аукциона по продаже земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома

Дата, время, место проведения аукциона		**3 сентября 2019 года в 10.00** в здании Поставского районного исполнительного комитета (г. Поставы, пл. Ленина, 25, 4-й этаж, малый зал)				
№ лота	Адрес участка	Площадь, га	Кадастровый номер	Наличие ограничений в использовании	Начальная цена, руб.	Сумма, подлежащая возмещению организатору аукциона на его проведение, руб.
1	Лынтупский сельисполком Витебская обл., Поставский район. д. Роскошь, ул. Роскошная, 8А	0,2468	224082820801000022	Земельный участок имеет ограничения в использовании земельного участка в связи с расположением его на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне реки, водоема) и в придорожных полосах (контролируемых зонах) автомобильных дорог	2 000,00	1386,00 плюс затраты на публикацию

Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона	- в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола аукциона внести плату за земельный участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с их изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формирования земельного участка, в т. ч. государственной регистрации; - в течение двух месяцев со дня утверждения протокола аукциона в установленном порядке обратиться за государственной регистрацией прав, ограничений прав на земельный участок; - получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство одноквартирного жилого дома; - приступить к занятию земельного участка в течение года со дня государственной регистрации земельного участка, возникновения права на него в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство)
Порядок осмотра на местности земельного участка	В рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по мере обращений лиц, заинтересованных в участии в аукционе. Обращаться в землеустроительную службу Поставского райисполкома г. Поставы, пл. Ленина, 25, 1-й этаж, каб. 11
Перечень необходимых документов, представляемых участниками аукциона до его начала	- заявление на участие в аукционе (бланк можно получить и заполнить непосредственно в отделе землеустройства) - квитанцию об уплате задатка; - ксерокопии стр. 25, 31, 32, 33 общегражданского паспорта без нотариального засвидетельствования; - представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.
Место, дата и время начала и окончания приема заявлений	г. Поставы, пл. Ленина, 25, 1-й этаж, каб. 11 в рабочие дни с 8.00 до 17.00 со дня публикации извещения **по 28 августа 2019** года включительно
Размер задатка, срок и порядок его внесения	10 % от начальной цены соответствующего участка до подачи заявления на счет сельисполкома. Реквизиты платежа указаны в бланке заявления на участие в аукционе
Адрес и номер контактного телефона комиссии	г. Поставы, пл. Ленина, 25, 1-й этаж, каб.11 в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, телефоны 8 (02155) 4 3180, 41132

УНП 300077196

«НАШ АГУЛЬНЫ БЕЛАРУСКІ І ЗА ЯГО НЕ СОРАМНА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Леанід Канстанцінавіч, цягам прынамсі апошняй чвэрці стагоддзя да Магілёўшчыны асаблівая ўвага, паколькі ўраджэнец вобласці стаў Прэзідэнтам суверэннай Беларусі. Якія змены адбыліся ў рэгіёне за гэты час, ці ўдаецца адпавядаць такому статусу?

— Што да першай часткі пытання, то тут я не магу цалкам пагадзіцца. Безумоўна, увага існуе — з боку кіраўніка дзяржавы, з боку ўрада. Увага вялікая, але наўрад ці яе больш, чым да іншых рэгіёнаў нашай краіны. Жыхары вобласці ганарацца, што іх зямляк — першы Прэзідэнт Беларусі, і гэта накладае пэўную адказнасць. Трэба адпавядаць. Нельга, каб малая радзіма беларускага лідара была ў аўтсайдарах. Але праблем насамрэч хапае, у прыватнасці, у эканоміцы. Праблемы вырашальныя, і над належным вырашэннем мы працуем.

«Сёлета пачынаем будаўніцтва дубль-трасы, якая звяжа буйны раён Казіміраўку з праспектам Касманаўтаў. Гэтая магістраль вырашыць транспартную праблему вялікай часткі горада».

Калі казаць пра змены за апошнія 25 гадоў, то, пагадзіцеся, цалкам відавочна — наша краіна, і Магілёўская вобласць не выключэнне, зрабілі вялікі крок, а то і некалькі крокаў наперад. Адбыліся каласальныя змены абсалютна ва ўсіх сферах жыцця. Упэўнены, палітычныя падзеі 1994 года сталі адлікам новай гісторыі нашага народа. Беларусы абралі свой уласны шлях развіцця — жыць сваім розумам і сваёй працай. Нагадаю, што мы адзіныя з былых рэспублік СССР не пайшлі на вар'яцкую прыватызацыю, стварылі стабільную эканоміку, захавалі сацыяльна арыентаваную мадэль дзяржавы. Мы пайшлі шляхам эвалюцыі. Самае галоўнае — змяніліся людзі. Беларусы сталі больш прадпрымальнымі, дысцыплінаванымі, мы пачалі больш пяшчотна ставіцца да сваёй зямлі, з пашанай ставімся да гісторыі і будуем уласную будучыню. Можна шмат казаць пра змены ў эканоміцы, грамадстве. Падаецца, што не хопіць месца ў вашай газеце, якую, дарэчы, я рэгулярна чытаю.

— Новы імпульс у развіцці сямі паўднёва-ўсходніх раёнаў Магілёўшчыны павінен быў надаць Указ № 235. Наколькі паспяхова ідзе яго рэалізацыя?

— Гэта вельмі важны дакумент, які павінен быў даць штуршок у развіцці сямі раёнаў — Клімавіцкага, Касцюковіцкага, Краснапольскага, Крычаўскага, Слаўгарадскага, Чэрыкаўскага і Хоцімскага. Нагадаю, указ прадугледжвае значныя льготы для інвестараў, перадумовы для развіцця бізнесу, стварэння новых рабочых месцаў і росту дабрабыту людзей. За чатыры гады ў гэтых раёнах былі створаны 189 новых камерцыйных арганізацый. На ноых прадпрыемствах і вытворчасцях працаўладкавана амаль дзве тысячы чалавек. Сярод найбольш буйных праектаў трэба адзначыць завод па вытворчасці цэментава-стружкавых пліт у Крычаўскім раёне, фотаэлектрычныя станцыі па выпрацоўцы электрычнай энергіі ў Чэрыкаўскім раёне. Беларускі цэментны завод і «Крычаўцэментнашыфер» ажыццявілі буйны праект па мадэрнізацыі вытворчых ліній. Улічваючы, што паўднёва-ўсходні рэгіён вобласці мае ў асноўным сельскагаспадарчую спецыялізацыю, асаблівую ўвагу аддаём пытанням развіцця аграрнага сектара. Напрыклад, у Слаўгарадскім раёне зараз завяршаецца будаўніцтва свінагадоўчага комплексу праектнай магутнасцю ў 24 тысячы галоў штогод. Гэта будзе высокатэхналагічнае і канкурэнтаздольнае прадпрыемства, дзякуючы якому Магілёўскі мясакамбінат здолее выйсці на новы ўзровень — істотна павялічыць аб'ёмы вытворчасці і рэнтабельнасць. Акрамя гэтага, у паўднёва-ўсходніх раёнах вобласці актывізавалася будаўніцтва жылля, уведзены ў строй новыя фізкультурна-аздараўленчыя комплексы ў Касцюковічах і Краснаполлі.

Але казаць пра абсалютны поспех дзеяння ўказа зараз, на жаль, не прыходзіцца. Прэферэнцыі, якія мы можам прапанаваць інвестарам у гэтым рэгіёне, не адрозніваюцца і нават саступаюць тым, што прапануюць рэзідэнтам свабодных эканамічных зон. Таму буйныя інвестары аддаюць перавагу абласным цэнтрам і прылеглым да іх раёнам. Для інвестара сёння прывабныя не толькі льготы, але і створаная інфраструктура, доступ да рэсурсных крыніц, у тым ліку і працоўных. Разам з тым мы працягваем работу па стварэнні прывабных умоў для інвеставання ў паўднёва-ўсходні рэгіён і павышэнні ўзроўню і якасці жыцця яго жыхароў.

— Інвестыцыі і новыя рабочыя месцы — прыярытэтныя кірункі ў развіцці любога грамадства. Як з гэтым на Магілёўшчыне? Ці ахвотна ўкладаюцца грошы і ў якія сферы непасрэдна?

— Сапраўды, як для краіны, так і для Магілёўскай вобласці, у прыватнасці, прыцягненне інвестыцый — адзін з галоўных прыярытэтаў. І тут у рэгіёне назіраецца станоучая дынаміка. Напрыклад, летась на развіццё эканомікі і сацыяльнай сферы Магілёўшчыны з усіх крыніц фінансавання было выдаткавана больш за паўтара мільярда рублёў інвестыцый у асноўны капітал. Ёсць зацікаўленасць і з боку нашых замежных партнёраў. Толькі за першы квартал гэтага года мы прыцягнулі 100 мільёнаў долараў замежных інвестыцый. Лічбы насамрэч неблагія. Але заўсёды ёсць жаданне, каб яны былі яшчэ вышэйшыя. І перадумовы існуюць. Галоўнае — гэта добры інвестклімат, які створаны ў нашай дзяржаве. Добрай рэкламай Магілёўшчыне служаць ужо дзеючыя праекты, якія паспяхова рэалізуюцца. Яны паказваюць прыклад — тут можна рабіць бізнес, сюды трэба ўкладваць грошы. Напрыканцы чэрвеня ў Магілёве прайшоў Міжнародны інвестыцыйны форум «Млын поспеху». Да нас прыехалі прадстаўнікі бізнес-колаў з 20 краін свету. На форуме мы падпісалі пакет пагадненняў больш чым на 170 мільёнаў долараў. А за іх рэалізацыяй стаіць стварэнне 650 новых рабочых месцаў. Цяпер у вобласці ідзе рэалізацыя некалькіх сур'ёзных інвестпраектаў. Маштабная мадэрнізацыя працягваецца на «Магатэксе» і шклозаводзе ў Ялізаве, узбуйняецца цяплічная гаспадарка ў Бабруйску, у Бялыніцкім раёне ідзе стварэнне даволі буйнога аграпрадпрыемства па вытворчасці збожжа і дацкай беконнай свініны. Дарэчы, гэтая ж кампанія плануе пабудаваць аналагічнае прадпрыемства і ў Крычаўскім раёне.

— Сельская гаспадарка Магілёўшчыны грунтуецца на развіцці буйнатаварнай вытворчасці, стварэнні агрохалдынгаў. З іншага боку — у рэгіёне яшчэ з 1990-х ствараюцца фермерскія гаспадаркі, шэраг з якіх знайшлі сваю нішу і сталі высокарэнтабельнымі прадпрыемствамі. У чым, на ваш погляд, эфектыўная формула развіцця АПК для вобласці?

— У першую чаргу эфектыўнасць залежыць ад выканання тэхналогіі і гаспадарскага падыходу да справы. А залежнасць рэнтабельнасці ад таго, якая форма ўласнасці гаспадаркі — дзяржаўная ці прыватная, — насамрэч прыдуманая. Мы маем шмат прыкладаў, калі калгас працуе вельмі паспяхова і калі фермер ледзьве зводзіць канцы з канцамі. І наадварот. Як гаворыцца, кадры вырашаюць усё.

У пяцігадовай праграме развіцця краіны вызначаны найбольш важныя кірункі развіцця АПК. У тым ліку праз стварэнне холдынгаў — аб'яднанні гаспадарчых суб'ектаў. Такі курс павінен вырашыць асноўныя задачы: павышэнне эфектыўнасці аграрнай вытворчасці і дабрабыту работнікаў. Гэтага можна дасягнуць за кошт прымянення карпаратыўнай сістэмы кіравання, распрацоўкі ўзгодненай фінансавай і вытворчай палітыкі, пераходу да прынцыпова новай сістэмы матывацыі кіраўнікоў і работнікаў прадпрыемстваў па выніках працы. Буйнатаварныя гаспадаркі — гэта, у першую чаргу, замкнёны цыкл вытворчасці — ад поля да крамы. Гэта вытворчасць не сыравіны, а гатовай прадукцыі з высокай дабаўленай вартасцю.

У той жа час дзяржава падтрымлівае і фермерскія гаспадаркі. Дапамога аказваецца юрыдычная і фінансавая. Летась са сродкаў бюджэту фермерам было выплачана 400 тысяч рублёў субсідый. Тых, хто жадае працаваць на зямлі, становіцца больш. Цяпер у рэгіёне зарэгістравана амаль паўтысячы фермерскіх гаспадарак. Але аддача пакуль не ўражвае. Доля фермераў у агульным аб'ёме вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі ўсяго 2,3 працэнта. Лічба нязначная. Але і ў гэтым сектары ёсць свае лідары, якія сталі арыенцірамі для іншых. Узяць, напрыклад, фермерскую гаспадарку «Дыяна» ў Шклоўскім раёне, якая спецыялізуецца на вырошчванні бульбы. Рэкордная ўраджайнасць, сучасныя сховішчы і тэхніка, годны заробак работнікаў... Большасць прадукцыі ідзе на экспарт. Гаспадарка зарабляе валюту. Там працуе вельмі пісьменны і вопытны кіраўнік Уладзімір Маліноўскі. Гэта зноў пацвярджае меркаванне, што гаспадарскі падыход — ключавы фактар поспеху.

— Адзін з флагманаў сельскагаспадарчай адукацыі ў краіне — Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія, гэта насамрэч і буйны навукова-практычны цэнтр. Наколькі дзейсна яна дапамагае АПК у плане кадраў і ўкаранення найноўшых напрацовак? Як развіваецца альма-матар Прэзідэнта — Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт? І ўвогуле, наколькі аператыўна і якасна рэагуюць адукацыйныя ўстановы вобласці на патрэбу дзяржавы ў неабходных спецыялістах?

— Маштабнае пытанне, але паспрабую адказаць коратка і ёмістa. Калі гаворым пра Горацкую сельскагаспадарчую акадэмію, то безумоўна, гэта флагман у падрыхтоўцы кадраў для АПК. Штогод акадэмія выпускае больш за 2000 высокакваліфікаваных спецыялістаў. Выпускнікі БДСГА складаюць аснову кадравага забеспячэння сельскай гаспадаркі краіны. Сёння акадэмія — гэта навуковы цэнтр з шырока развітой інфраструктурай і сучаснай матэрыяльна-тэхнічнай базай. Горацкія вучоныя рэгулярна праводзяць навучальныя семінары, даследаванні і маніторынгі ў гаспадарках, даюць аграрыям каштоўныя рэкамендацыі, распрацоўваюць інавацыйныя тэхналогіі для земляробства і жывёлагадоўлі. Напрыклад, распрацаваная ў акадэміі праграма «Канструктар рацыёнаў кармлення» ўжо ўстаноўлена больш чым у 100 гаспадарках краіны. Яна прызначана для выбару аптымальнай камбінацыі кармоў і дабавак для буйной рагатай жывёлы. У аснове праграмы — інтэлектуальная матэматычная працэдура аптымізацыі, якая ўлічвае вагу, узрост, стан здароўя

«Калі казаць пра змены за апошнія 25 гадоў, то, пагадзіцеся, цалкам відавочна — наша краіна, і Магілёўская вобласць не выключэнне, зрабіла вялікі крок, а то і некалькі крокаў наперад. Адбыліся каласальныя змены абсалютна ва ўсіх сферах жыцця. Упэўнены, палітычныя падзеі 1994 года сталі адлікам новай гісторыі нашага народа. Беларусы абралі свой уласны шлях развіцця — жыць сваім розумам і сваёй працай».

ДОМ АТРЫМАЎСЯ МОЦНЫ, ПЕРАД СУСЕДЗЯМІ»

жывёлы, іншыя фактары і складае аптымальны для яе рацыён. І гэта толькі адзінкавы прыклад эфектыўнага супрацоўніцтва аграрнай навукі і вытворчасці.

Што да Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Куляшова, то сёння гэтая ВНУ — галоўны адукацыйны навукова-метадычны цэнтр сістэмы адукацыі Магілёўскай вобласці. Фундаментальныя і прыкладныя даследаванні на пярэднім краі сучасных навуковых ведаў: электроніка і фатоніка, лазерна-аптычная дыягностыка, экалогія і прыродакарыстанне, аграэкатурызм, шэраг даследаванняў у галіне матэматыкі, фізікі, хіміі, інфармацыйных тэхналогій. Таксама навукоўцы ўдзельнічаюць у дзейнасці па ўдасканальванні адукацыйных праграм і стандартаў. А з улікам узнікаючых патрэб ва ўніверсітэце карэктуюць набор абітурыентаў і адкрываюць падрыхтоўку па новых спецыяльнасцях. Так, напрыклад, налета тут пачнуць рыхтаваць праграмістаў і біёлагаў-аналітыкаў.

Тое ж датычыцца і іншых нашых вышэйшых навучальных устаноў. У Беларуска-расійскім універсітэце і Магілёўскім універсітэце харчавання таксама гібка рэагуюць на патрэбы рынку працы.

«У першую чаргу эфектыўнасць залежыць ад выканання тэхналогіі і гаспадарскага падыходу да справы. А залежнасць рэнтабельнасці ад таго, якая форма ўласнасці гаспадаркі — дзяржаўная ці прыватная, — насамрэч прыдуманая. Мы маем шмат прыкладаў, калі калгас працуе вельмі паспяхова і калі фермер ледзьве зводзіць канцы з канцамі. І наадварот. Як гаворыцца, кадры вырашаюць усё».

Фота БелТА.

На рэспубліканскім свяце «Купалле» Леанід ЗАЯЦ узнагародзіў лепшых аграрыяў Магілёўскай вобласці па выніках працы ў 2018 годзе.

— Сёлета значная доля абласнога бюджэту выдзяляецца на ўмацаванне медыцынскай базы вобласці. Наколькі адчувальна атрымліваецца мадэрнізаваць гэтую галіну? У зборы сродкаў для рэканструкцыі Бабруйскай дзіцячай бальніцы ўдзельнічалі і насельніцтва, і дэпутаты, і дзяржава. Якія дзеянні будуць адбывацца сёлета на гэтым аб'екце?

— Спадзяюся, нам многае ўдасца зрабіць у гэтым кірунку. Здароўе людзей заўсёды павінна быць у прыярытэце дзяржавы. Сродкі на ўмацаванне медыцынскай базы сапраўды выдзяляюцца вельмі істотныя — амаль 20 мільёнаў рублёў. Грошы пойдуць на бягучы і капітальны рамонт устаноў аховы здароўя, а таксама на набыццё медабсталявання. На гэты год у нас запланаваны шэраг важных аб'ектаў. У Асіповічах будзе завершана будаўніцтва тэрапеўтычнага корпуса раённай бальніцы. Упэўнены, дзякуючы гэтаму медыцынская дапамога ў раёне выйдзе на новы якасны ўзровень. Таксама сёлета завершацца работы па рэканструкцыі радзільнага дома ў Магілёўскай гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі. Рэканструкцыя доўгачаканая. Ранейшыя ўмовы для маладых маці і акушэраў былі, мякка кажучы, кепскімі. Цяпер там будуць прасторныя і ўтульныя палаты і сучаснае медыцынскае абсталяванне — усё, каб роды і знаходжанне маці і немаўлят у радзільні былі максімальна спакойныя і камфортныя.

Яшчэ адзін вельмі важны аб'ект — лячэбны корпус дзіцячай бальніцы ў Бабруйску. Яго рэканструкцыя ідзе поўным ходам, плануецца завяршэнне работ у лістападзе наступнага года. Рэканструкцыя сапраўды маштабная. Гэта і ўсталяванне новага даху, новых вокнаў, і ўцяпленне сцен. Праводзяцца вялікія ўнутраныя работы, цалкам ідзе замена сістэм ацяплення, электрычнасці, водазабеспячэння, каналізацыі. Па сутнасці, гэта будзе новы будынак. Фінансаванне ідзе з розных крыніц. На 2019 год дзяржава выдаткавала 2,5 мільёна рублёў. Таксама паступаюць сродкі з дабрачыннага рахунку. На сёння людзі сабралі больш за 300 тысяч рублёў. Дапамагаюць усе — працоўныя калектывы, прадпрымальнікі, дэпутаты і звычайныя людзі. Гэта пацвярджае кансалідаванасць нашага грамадства, гатоўнасць людзей рабіць добрую справу.

У Магілёве ёсць патрэба ў будаўніцтве паліклінікі ў буйным мікрараёне Казіміраўцы, а таксама ў будаўніцтве кардыяхірургічнага корпуса ў абласной бальніцы. Там ёсць выдатныя прафесіяналы, якія гатовы праводзіць аперацыі на сэрцы любой складанасці. Але не хапае аперацыйных. Пытанне сур'ёзнае, і мы маем цвёрды намер вырашыць яго станоўча. Абодва аб'екты дадаткова ўключаны ў інвестыцыйную праграму на 2019 год, хутка пачнём будаўніцтва.

Увогуле лічу, што сучасная айчынная медыцына развіваецца добрымі тэмпамі і знаходзіцца на вельмі высокім узроўні. У нашым рэгіёне створана цудоўная лячэбна-дыягнастычная база, якая дазваляе ўкараняць найноўшыя метады дыягностыкі і лячэння. Але, безумоўна, галоўнае ў нашай медыцыне — высокакваліфікаваныя спецыялісты: урачы і іх памочнікі.

— Турыстычны патэнцыял вобласці дае магчымасць папулярызаваць сваю спадчыну, прывабліваць вялікую колькасць людзей, заводзіць карысныя сувязі. Але не заўсёды на гэта знаходзяцца сродкі. Як даводзіцца выходзіць з сітуацыі? На што ў першую чаргу выдзяляюцца грошы?

В отношении имущества в таблице № 2 проводятся шестые повторные торги. Лоты расположены на земельном участке с кадастровым номером № 623050100001002242 по адресу: г. Крупки, ул. Московская, 1. Земельный участок предоставлен для обслуживания зданий и сооружений производственной базы на праве аренды до 2102 года. Публикация об аукционе ранее размещалась 02.07.2019 г. в газете «Звязда». Цена на предмет торгов снижена на 50 %. Окончание приема заявлений в 12.00 12.08.2019.	
Задаток	10 % от начальной стоимости предмета торгов
Шаг аукциона	5 % от начальной стоимости предмета торгов
Организатор торгов	ООО «Фрондера», +375 29 305 86 50; e-mail: frondera@mail.ru
Информация о продавце	ОАО «Крупский плодоовощной завод», Минская область, г. Крупки, ул. Московская, д.1 (ликвидатор – ООО «Партнер-Консультант», +375 29 304-59-90)
Дата и время проведения торгов	**13 августа 2019 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д.1, оф. 1121
Заявление на участие в торгах и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1121	
Условия для участия в торгах	До подачи заявления внести задаток на р/с BY36ALFA30122215570040270000, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах. Подать заявление на участие в торгах, документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка. К заявлению на участие в торгах прилагаются документы согласно п. 12 Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов» утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 N 16. Образец заявления и перечень документов можно посмотреть на сайте https://sites.google.com/site/pcjuristcom/informacia-o-torgah. Лица, желающие принять участие в аукционе и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов. Договор купли-продажи заключается между продавцом и победителем аукциона (приравненным к нему лицом) в белорусских рублях в течение 5 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона и возмещения победителем затрат по организации и проведению торгов в размере 5 % от начальной стоимости объекта торгов, а также затрат по размещению публикации (согласно выставленному счету). Оплата приобретенного предмета торгов должна быть проведена в полном объеме не позднее 10 рабочих дней с даты подписания договора купли-продажи. 4. В случае если аукционом признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона. 5. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. Контактное лицо для осмотра объекта торгов: +375 29 304-59-90.

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «МПЗ» (Продавец)

Лот № 1: 1. Здание службы механика, инв. № 500/С-55970, 1999 г. п. Площадь 17,7 м². Адрес: г. Минск, ул. Жилуновича, 2/15. 2. Здание специализированное обрабатывающей промышленности инв. № 500/С-39621, 1992 г. п. Площадь 350,9 м². Адрес: г. Минск, ул. Жилуновича, 2/11. **Начальная цена** с НДС – 199 797,70 бел. руб. **Задаток –** 20 000,00 бел. руб. Земельный участок: кадастровый номер 500000000002002072, площадь 1,1882 га. Право временного пользования. На земельном участке расположены иные объекты, которые не выставляются на аукцион. Список обременений на земельный участок на сайте Организатора аукциона ino.by.

Лот № 2: незавершенное законсервированное строение, инв. № 500/U-1026105. Площадь 857,6 м². Адрес: г. Минск, ул. Жилуновича, 2/7. **Начальная цена** с НДС – 1 520 146,80 бел. руб. **Задаток –** 100 000,00 бел. руб. Земельный участок: кадастровый номер 500000000002008444, площадь 36,8556 га. Право общей долевой аренды. Доля: 99/100. На земельном участке расположены иные объекты, которые не выставляются на аукцион. Список обременений на земельный участок на сайте Организатора аукциона ino.by.

Аукцион состоится 23.08.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 23.08.2019 (ОАО «МПЗ», Лота №__). Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 21.08.2019 в 11.00. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 14.06.2019.

Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, www.ino.by, e-mail: torgi@ino.by

---

ОАО «Дзержинский экспериментально-механический завод» сообщает, что аукцион о продаже имущества, объявленный на 2 августа 2019 г., отменен.

УНП 600004946

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. Пачатак тыдня давядзецца прысвяціць выкананню шматлікіх абяцанняў, якія вы з лёгкасцю раздавалі раней. У сераду будзьце гатовыя замяніць рашучасць тактоўнасцю і гатоўнасцю да кампрамісаў. У чацвер не варта раздражняць начальства парушэннямі дысцыпліны або неапраўданымі патрабаваннямі — гэта можа не вельмі добра скончыцца.

ЦЯЛЕЦ. Па магчымасці звядзіце аб'ём працы да разумнага мінімуму і больш адпачывайце. Або адпраўляйцеся, нарэшце, у адпачынак. Калі ж такой магчымасці няма, трэба сабраць сябе ў кулак — важная справа запатрабуе ад вас максімальнай засяроджанасці і хуткасці дзеянняў. У аўторак рэкамендуецца не гаварыць лішняга, каб не справакаваць канфлікту з бліжэйшым акружэннем. У выхадныя вы лёгка выправіце дробныя непаладкі і наведзяце ў сваім доме амаль ідэальную чысціню.

БЛІЗНЯТЫ. Можаце стаць выдатным арганізатарам свят. Вы адчуваеце гармонію і радасць і гатовыя гэтым дзяліцца. Але не ператамляйцеся, плануйце толькі рэальныя справы, каб не адчуваць расчаравання, калі нешта не паспее ці не зрабіць. Вас атачаюць сябры і аднадумцы. Зоркі прадракаюць шмат прыемных імгненняў і ўражанняў. Не выключана незабыўнае спатканне.

РАК. Вы зараз сабраныя і мэтанакіраваныя. Надышоў важны перыяд, які дазволіць раскрыць здольнасці ў прафесійным плане. Паспрабуйце быць як мага больш сканцэнтраванымі і не марнуйце свае сілы па дробязях. Забудзьцеся пра сваю недаверлівасць і сумневы. Здабыўшы душэўны спакой, адчуеце сябе гаспадаром становішча.

ЛЕЎ. Цярпенне і вытрымка дазволяць вам паказаць навакольным свае найлепшыя якасці. Ваша непрадказальнасць чароўная, але яна часам можа быць стомнай. Блізкія не паспяваюць за палётам вашай фантазіі. У сераду не варта рабіць стаўку на мінулыя дасягненні і шанцаванне: памятайце, што спадарыня Фартуна любіць пакапрызіць. Не спрабуйце вырашыць свае і чужыя праблемы разам, інакш да канца тыдня адчуеце заняпад сіл.

ДЗЕВА. У пачатку тыдня паспрабуйце праявіць вытрымку і дыпламатычнасць. Рознагалоссі з калегамі павінны быць урэгуляваны ў выключна парламенцкіх выразах, як бы вам ні хацелася ўжыць больш моцныя сродкі. Абставіны будуць падштурхоўваць вас да перагляду многіх прынцыпаў. Але лепш захаваць вернасць сабе.

ШАЛІ. Перад вамі адкрываюцца перспектывы кар'ернага росту. Але паспрабуйце рэальна ацэньваць сілы і магчымасці і браць на сябе толькі той аб'ём работы, з якім вы справіцеся без шкоды для здароўя. У панядзелак будуць вельмі ўдалымі паездкі і камандзіроўкі. Сераду, калі не будзеце адпачываць, прысвяціце дзелавым сустрэчам і перамовам. Дзень спрыяльны для пошуку дадатковай крыніцы даходаў.

СКАРПІЁН. Імаверны рост у прафесійнай сферы. З'явіцца шанц заняць кіруючую пасаду. Прыняцце важнага рашэння адкладзіце да сярэдзіны тыдня. Дазвольце сабе адчуваць, кахаць, пакутаваць, бо ўсё гэта складнікі шчасця, неўзабаве вы гэта зразумееце. Зоркі кажуць, што адносіны, у якіх вы цяпер знаходзіцеся, самыя важныя ў вашым жыцці.

СТРАЛЕЦ. Большая частка праблем будзе пераадоленая, прычым амаль без намаганняў з вашага боку. Верагодная ўдалая паездка ці падрыхтоўка да яе. Надыходзіць добры час для адпачынку і курортнага рамана. Чацвер можа настроіць вас на прыняцце кардынальных рашэнняў. У пятніцу цікавыя ідэі ўзнікнуць раптоўна. Паспрабуйце не аспрэчваць іх адразу — там будуць і карысныя.

КАЗЯРОГ. Будзе неабходна ўтрымацца на высокім прафесійным узроўні, нават калі вашы думкі больш занятыя летнім адпачынкам. Упэўненасць у сваіх магчымасцях і паслядоўнасць у дзеяннях дапамогуць завяваць прыхільнасць навакольных і ўмацаваць добрыя адносіны з начальствам. Важна правільна арганізаваць працоўны працэс, каб ні хвіліны не прапала дарма. У другой палове тыдня не выключаны сваркі ў сям'і.

ВАДАЛІЙ. У справах назіраецца застой. Вам будзе сумна выконваць руцінныя дзеянні. Паспрабуйце выйсці на новы ўзровень. Тыдзень абяцае быць плённы. Не бойцеся перашкод, якія будуць узнікаць на вашым шляху, яны цалкам пераадольныя. У сераду могуць парадаваць весткі здалёку. У пятніцу паспрабуйце знайсці час для зносін са сваякамі. Праекты, пачатыя ў суботу, будуць мець паспяховае завяршэнне.

РЫБЫ. Пажадана запасціся пэўнай доляй рэалізму, злёгку прыцішыць прафесійныя амбіцыі і дзейнічаць больш абачліва. У сераду не варта правакаваць канфліктныя сітуацыі, спазняючыся на работу, зрываючы тэрміны і парушаючы дамоўленасці. У чацвер можаце апынуцца ў няпростай сітуацыі, давядзецца абыходзіць падводныя камяні.

Даты Падзеі Людзі

2 ЖНІЎНЯ

1549 год — нарадзіўся Мікалай Хрыстафор Радзівіл (Сіротка), адзін з прадстаўнікоў найбуйнейшага магнацкага роду, дзяржаўны і ваенны дзеяч ВКЛ, мецэнат, пісьменнік. Сын Мікалая Чорнага. Маршалак вялікі літоўскі, кашталян троцкі, ваявода троцкі і віленскі. Спрыяў росквіту Нясвіжа, садзейнічаў атрыманню горадам у 1586 годзе магдэбургскага права. Пры ім былі пабудаваныя нясвіжскія гарадскія ўмацаванні, ратуша і гандлёвыя рады, а таксама замак, у якім ён размясціў галерэю партрэтаў, бібліятэку. Заснаваў шпіталі ў Нясвіжы і Міры. Арганізаваў палявыя картаграфічныя работы, фінансаваў выданне першай падрабязнай карты ВКЛ. Памёр у 1616 годзе.

1840 год — выйшаў указ імператара Мікалая I аб спыненні дзейнасці на тэрыторыі Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губерняў Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 года.

1875 год — нарадзіўся Яўген Піліпавіч Алонаў, ветэрынарны ўрач, заснавальнік навуковай ветэрынарыі ў Беларусі. У 1913 годзе ў Віцебску заснаваў першую ў Беларусі ветэрынарную лабараторыю. Заснавальнік Віцебскага ветэрынарнага інстытута. Па яго ініцыятыве ў Віцебску заснаваныя ветэрынарна-заалагічны музей, батанічны сад, музей анатоміі, арніталогіі і энтамалогіі. Памёр у 1929 годзе.

1914 год — у горадзе Баранавічы размясцілася Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага ўзброенымі сіламі Расіі (знаходзілася там да 3 верасня 1915-га).

1932 год — прынята пастанова СНК БССР аб увядзенні ў рэспубліцы ўсеагульнай сямігадовай адукацыі.

1964 год — у сувязі з будаўніцтвам Лукомскай ГРЭС заснаваны горад Новалукомль. Будаўніцтва гэтай найбуйнейшай цеплавой электрастанцыі беларускай энергетычнай сістэмы пачалося на беразе Лукомскага возера (скончылася ў 1974 годзе). Рабочы пасёлак будаўнікоў электрастанцыі хутка вырас у горад Новалукомль.

1542 год — іспанскі канкістадор Франсіска дэ Арэльяна пасля 172-дзённага плавання ўніз па Амазонцы дасягнуў Атлантычнага акіяна, стаўшы першым чалавекам, які перасёк Паўднёвую Амерыку ад акіяна да акіяна ў самай шырокай яе частцы, і першаадкрывальнікам найбуйнейшай ракі ў свеце.

1832 год — нарадзіўся Аляксандр Мікалаевіч Энгельгарт, рускі публіцыст, вучоны-аграхімік. У 1866—1890 гадах прафесар хіміі Пецярбургскага земляробчага інстытута. Аўтар лістоў і шэрагу работ па пытаннях сельскай гаспадаркі. Выступаў за знішчэнне памешчыцкага землеўладання і перадачу зямлі сялянам, заклікаў інтэлігенцыю «сесці на зямлю», стварыць арцелі «інтэлігентных мужыкоў», якія пераўтвораць сельскую гаспадарку на навуковай аснове. Памёр у 1893 годзе.

1932 год — нарадзіўся Пітэр О'Тул, англійскі акцёр кіно. Здымаўся ў фільмах «Як скрасці мільён», «Лоўрэнс Аравійскі», «Кіруючы клас» і іншых. У 2003 годзе ўдастоены ганаровага «Оскара» за выбітны ўнёсак у развіццё кінамастацтва. Памёр у 2013 годзе.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.24	21.06	15.42
Віцебск —	5.08	21.02	15.54
Магілёў —	5.14	20.57	15.43
Гомель —	5.17	20.47	15.30
Гродна —	5.41	21.21	15.40
Брэст —	5.48	21.15	15.27

Месяц

Маладзік 1 жніўня.
Месяц у сузор'і Дзевы.

Імяніны

Пр. *Абрама, Аляксандра, Апанаса, Георгія, Івана, Кузьмы, Сяргея, Фёдара, Ціхана.*
К. *Карыны, Марыі, Густава, Сцяпана.*

Фота Віктарыі МІРОНЧЫК.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

— Ты чула, на выхадныя перадаюць моцны вецер?..

— Божухна! Зноў мяне куды-небудзь заняпсе!

Група турыстаў, фатаграфуючы адно аднаго і кожны сам сябе, апынулася ўсярэдзіне нейкага музея, дзе рабіць фота забараняецца, і яны гляджаць на стол і сцены ў поўнай разгубленасці, не ведаючы, што з гэтым усім рабіць, калі не фатаграфаваць.

— Давай больш не будзем там заказваць піцу? У яе была вельмі сухая і цвёрдая аснова...

— Дарагая, гэта быў кардон ад скрынкі.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ тэл./факс: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2782.

Нумар падпісаны ў 19.30 1 жніўня 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

2 жніўня 2019 г. № 31 (516)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ТЭМА ТЫДНЯ

ДОБРЫ ЗАЧЫН

Першы Форум рэгіёнаў Беларусі і Узбекістана атрымаў станоўчыя ацэнкі

Вынікі яго будуць падведзены праз год — на другім падобным форуме, які пройдзе на тэрыторыі Узбекістана, але ўжо цяпер ёсць падставы чакаць, што яны будуць добрыя.

За два дні работы форуму было падпісана 26 прамых пагадненняў паміж рэгіёнамі. Яшчэ шэраг — падчас сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў. У работу запушчаныя больш за 20 камерцыйных кантрактаў. Гэтаму папярэднічала вялікая работа на працягу апошняга года. Толькі сёлета адбылося больш за 70 візітаў беларускіх дэлегацый рознага ўзроўню ва Узбекістан. Кіраўнікі рэгіёнаў Узбекістана таксама наведалі нашу краіну з дзелавымі візітамі. У мерапрыемствах форуму ўдзельнічала больш за 1000 чалавек. На пленарным пасяджэнні былі прадстаўленыя ўсе рэгіёны дзвюх краін, а таксама міністэрствы і ведамствы, прадпрыемствы, навуковыя арганізацыі, вышэйшыя навучальныя ўстановы, установы культуры і бізнесу.

стар. 3

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Зорка Наваі

Сярод мноства мерапрыемстваў праграмы І Форуму рэгіёнаў Беларусі і Узбекістана адно было прысвечанае сусветна вядомаму сыну Узбекістана паэту і гуманісту Алішэру Наваі. У XV стагоддзі ўзышла зорка Наваі на небасхіл сусветнай культуры. Ён застаўся ў гісторыі як асветнік, выдатны дзяржаўны дзеяч, сябра вучоных і мастакоў, аўтар збору з пяці паэм і трох тысяч лірычных вершаў, характэрных для паэзіі Блізкага і Сярэдняга Усходу.

Бюст Алішэра Наваі ўрачыста адкрылі ў скверы на адной з цэнтральных вуліц Мінска ў прысутнасці мноства мінчан і замежных гасцей сталіцы. Да новага помніка былі ўскладзены жывыя кветкі.

— Ён быў не толькі паэтам, але і вялікім гуманістам, — зазначыла **намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Мар'яна ШЧОТКІНА,** — яго працы перакладзены на многія мовы свету. Сваёй глыбокай філасофіяй, разнастайнасцю вобразаў ён і сёння прыцягвае мноства людзей да сваіх твораў. Можна смела сказаць, што гэта спадчына ўсяго чалавецтва.

стар. 2

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Запрашаем у вёску!

За 16 гадоў колькасць аграэкасядзіб у нашай краіне з 34 павялічылася амаль да 2,5 тысячы.

стар. 4

Не канкурэнцыя, а кааперацыя

Якія цікавыя праекты беларускі і ўзбекскі бакі могуць рэалізаваць разам?

стар. 14

«Буслы» і буякі

Што можна было ўбачыць на выстаўцы айчынных дасягненняў, арганізаванай у Акадэміі навук?

стар. 15

Дні культуры і сумесныя трэніроўкі

Дзякуючы падпісанаму пагадненню дзве сталіцы — Беларусі і Узбекістана — стануць бліжэйшымі.

стар. 15

Ад Гродна да Ташкента

Супрацоўніцтва рэгіёнаў не мае межаў. У гэтым пераканаліся ўдзельнікі дэлегацыі бізнес-колаў Прынёмання.

стар. 16

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Больш плённа працаваць на ўзроўні рэгіёнаў

Такую думку выказаў старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ на сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Латвійскай Рэспублікі ў Беларусі Марціньшам ВІРСІСАМ, якая адбылася на пачатку тыдня.

Тэрмін кадэнцыі дыпламата падышоў да заканчэння, таму спікер верхняй палаты беларускага парламента падзякаваў яму за асабісты ўнёсак ва ўмацаванне і развіццё беларуска-латвійскіх адносін і супрацоўніцтва.

— Я мяркую, што той зачын, які быў зроблены дзякуючы вам, будзе добрым прыкладам для вашага пераемніка, — адзначыў Міхаіл Мясніковіч.

Фота Валерыя РУСЕЦКАГА.

Ён звярнуў увагу на тое, што беларускі бок заўсёды будзе імкнуцца да далейшага развіцця двухбаковага супрацоўніцтва і садзейнічаць умацаванню інтарэсаў дзвюх краін на міжнародных пляцоўках.

Дарэчы, тавараабарот, які склаўся летась, дэманструе нядрэнную дынаміку: прыкладна 600 мільёнаў долараў і рост на траціну ў параўнанні з 2017-м.

— Гэта добра, — ахарактарызаваў вынікі двухбаковага гандлю за 2018 год спікер верхняй палаты беларускага парламента і падкрэсліў, што не толькі таварапатокі з'яўляюцца асновай стасункаў: сёння існуе шмат сумесных кампаній, якія вядуць бізнес як у Беларусі, так і ў Латвіі.

— І ў мяне няма такой інфармацыі, што існуюць непераадольныя пытанні ці тыя, што маюць вялікія складанасці ў вырашэнні, — адзначыў ён.

Акрамя эканамічных стасункаў бадай што цэнтральнае месца, на думку старшыні Савета Рэспублікі, займаюць міжпарламенцкія кантакты: візіты і падтрымка рабочага дыялогу — гэта вельмі добры вынік двухбаковага супрацоўніцтва, якое мае перспектывы для свайго далейшага развіцця.

— Я хацеў бы, каб нашы рэгіёны супрацоўнічалі паміж сабой не толькі дзякуючы кантактам з цэнтра, але і на месцах, бо у нас агульная мяжа і шмат навуковых, універсітэцкіх кантактаў, — агучыў пажаданне Міхаіл Мясніковіч. — Нам таксама трэба досыць актыўна працаваць у сферы турызму, у тым ліку выкарыстоўваючы магчымасці курортаў і здраўніц. Мы будзем рады прымаць вашых грамадзян для аздараўлення.

Спікер верхняй палаты беларускага парламента звярнуў увагу на тое, што нашы народы заўсёды былі дастаткова блізкія, нягледзячы на сур'ёзныя асаблівасці кожнага з іх, але гэта ніколі не выклікала ніякіх супярэчнасцяў.

У сваю чаргу Марціньш Вірсіс адзначыў, што тыя адносіны, што склаліся за час яго кадэнцыі, могуць стаць добрай пляцоўкай для развіцця розных праектаў, як на міжурадавым, так і міжпарламенцкім узроўнях.

Што датычыцца новага пасла, ён адзначыў, што гэта вельмі вопытны дыпламат, які валодае досведам работы ў такіх краінах як ЗША, Кітай, Польшча, Літва і Фінляндыя.

— У нас ёсць цікавасць да праекта «Вялікі камень» і магчымасці далучыцца да ўдзелу ў ім. Тут дастаткова шмат невядомага, але як чалавек, знаёмы з гэтай краінай, ён будзе садзейнічаць гэтаму працэсу, — ахарактарызаваў Марціньш Вірсіс свайго пераемніка, які прыедзе ў Беларусь у пачатку жніўня.

Вольга АНУФРЫЕВА.

СУМЕСНЫ БІЗНЕС ЯК ГАРАНТЫЯ ЗБЛІЖЭННЯ

Першы намеснік старшыні Сената Олій Мажліса Рэспублікі Узбекістан Садык Сафаеў наведаў верхнюю палату беларускага парламента на другі дзень Форуму рэгіёнаў Беларусі і Узбекістана перад пачаткам пленарнага пасяджэння.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Міхаіл Мясніковіч падзякаваў узбекскаму калегу за візіт і шырокае прадстаўніцтва краіны на І Форуме рэгіёнаў Беларусі і Узбекістана.

«Сапраўды, кантакты паміж людзьмі патрэбныя, нягледзячы на тыя добрыя, выдатныя рашэнні інфармацыйных тэхналогій, якімі валодаюць нашы спецыялісты, але разам з тым жывыя стасункі заўсёды карысныя і можна больш даведацца і больш запазычыць», — сказаў, вітаючы гасцей, старшыня Савета Рэспублікі.

Спікер верхняй палаты беларускага парламента падкрэсліў, што наша краіна адкрытая для абмеркавання ўсіх без выключэння пытанняў, ці то эканамічных, ці то палітычных, парламенцкіх кантактаў або канкрэтных кірункаў: медыцына, сельская гаспадарка, інфармацыйныя тэхналогіі. «Мы адкрыты для дыялогу не толькі, каб паказаць, чым валодаем, мы гатовыя дзяліцца новымі ведамі ў тых або іншых галінах і сферах дзейнасці», — сказаў ён.

Міхаіл Мясніковіч заўважыў, што ў Беларусі станоўча ўспрымаецца актывізацыя дыялогу з Узбекістанам на вышэйшым і высокім узроўнях. «Сапраўды, гэта ўражвае і з'яўляюцца цікавыя новыя праекты, якія, безумоўна, будуць садзейнічаць шматбаковаму супрацоўніцтву», — дадаў старшыня Савета Рэспублікі.

Што датычыцца Форуму рэгіёнаў, то як першы, ён у многім носіць арганізацыйны характар: задае фармат і тон для будучых падобных сустрэч. Разам з тым гэта мерапрыемства стварае ўмовы для наладжвання прамых кантрактаў і пабудовы канкрэтных планаў на розных узроўнях.

«І тое, што ў нас з'яўляюцца сур'ёзныя сумесныя кампаніі, — гэта вельмі добра. Ёсць палітычная воля кіраўнікоў дзяржаў, і мы павінны апраўдаць гэты высокі давер. Сумесныя кампаніі — гэта аснова ўстойлівага супрацоўніцтва, свайго роду кропка незваротнасці ў адносінах, калі будзе сумесны бізнес, узаемны інтарэс. Сумесныя кампаніі — гэта не толькі прыбавачная вартасць, гэта доступ да інфармацыі, што вельмі важна. І мы гатовы працаваць па поўным тэхналагічным цыкле», — паабяцаў Міхаіл Мясніковіч.

Беларускі парламентарый паведаміў, што ў гэтым плане ўжо адбыўся абмен думкамі з нагоды стварэння гібрыдна-селекцыйных цэнтраў у жывёлагадоўлі.

Вельмі важнае значэнне для будучага ва ўзаемадзеянні дзвюх краін мае ўцягненне ў гэты працэс моладзі, лічыць спікер. Ён прапанаваў узяць пад парламенцкі кантроль стажыроўкі, студэнцкі і навуковы абмен, а таксама абмеркаваць пытанні змешанай падрыхтоўкі рабочых кадраў высокай кваліфікацыі і спецыялістаў, калі на першых курсах моладзь навучаецца ва Узбекістане, а потым — у Беларусі і атрымлівае дыплом еўрапейскага ўзору.

У сваю чаргу, Садык Сафаеў запэўніў, што ва Узбекістане надаюць вялікае значэнне развіццю супрацоўніцтва з Беларуссю. «Так атрымалася, што цягам многіх гадоў мы не змаглі намацаць пункты судакранання, але наш новы Прэзідэнт Шаўкат Мірзіёеў надае вялікае значэнне развіццю палітычнага дыялогу, эканамічнага супрацоўніцтва, культурна-гуманітарных сувязяў, ваенна-тэхнічнага партнёрства з Рэспублікай Беларусь. І вялізным крокам у фарміраванні новага этапу нашых двухбаковых адносін стаў гістарычны візіт Аляксандра Лукашэнкі ў верасні мінулага года ва Узбекістан. Ён адкрыў новыя далягляды нашага ўзаемадзеяння ва ўсіх сферах».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Зорка Наваі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Алішэр Наваі займае асобае месца ў сэрцы кожнага ўзбека, — дадаў **першы намеснік старшыні Сената Олій Мажліса Узбекістана Садык САФАЕЎ,** — яго творчасць пакінула незнікаючы след у культуры нашага народа. З непераўзыдзенай паэтычнай сілай ён уславіў найлепшыя якасці, пачуцці чалавека, любоў да сваёй радзімы і народа, роднай мовы.

Творы беларускіх і ўзбекскіх кампазітараў, якія прагучалі ў час урачыстасці, сталі сімвалічным музычным афармленнем цырымоніі адкрыцця помніка. Прыкладам неўміручасці паэтычных твораў Алішэра Наваі прагучаў адзін з яго вершаў, перакладзены на беларускую мову Уладзімірам Дубоўкай.

Народы Беларусі і Узбекістана аб'ядноўвае высокае пачуццё павагі да роднай мовы. Пацвярджэннем гэтаму — адкрыццё летась у сталіцы Узбекістана бюста аднаго з заснавальнікаў сучаснай беларускай мовы і літаратуры Якуба Коласа, чыя творчасць непарыўна звязаная з узбекскай зямлёй.

Спадчына, пакінутая чалавецтву геніяльным паэтам Усхода Алішэрам Наваі, і сёння застаецца актуальнай для кожнага з нас. Яна — сведчанне духоўнага адзінства і непарыўнай дружбы нашых народаў.

Яўген ПЯСЕЦКІ, фота аўтара.

ДОБРЫ ЗАЧЫН

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Умовы для мільярда

«Усё адбываецца ўпершыню, — падкрэсліла на адкрыцці пленарнага пасяджэння **намеснік старшыні Савета Рэспублікі і старшыня аргкамітэта форуму з беларускага боку Мар'яна ШЧОТКІНА.** — Гэта першы форум, першае пленарнае пасяджэнне, упершыню арганізавана маштабная выстаўка нацыянальнай прадукцыі Made in Uzbekistan, упершыню праходзяць Дні культуры Узбекістана, адбылося адкрыццё бюста выдатнага ўзбекскага паэта, мысляра, дзяржаўнага дзеяча Алішэра Наваі».

Добрым зачынам назваў форум і **старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.**

Беларусь разглядае Узбекістан як важнага перспектыўнага партнёра ў Цэнтральнай Азіі, заявіў ён. «Палітычны дыялог паміж нашымі краінамі за апошнія гады прыкметна актывізаваўся, міжпарламенцкія і міжурадавыя кантакты набылі сістэмны характар, умацоўваюцца гандлёва-эканамічныя сувязі, — пералічыў спікер. — Аднак супакойвацца няма падстаў. Узаемны гандаль трэба нарошчваць больш высокімі тэмпамі, каб дасягнуць аб'ёму гадавога тавараабароту ў адзін мільярд долараў. Такую задачу паставілі нам прэзідэнты».

Для дасягнення гэтай мэты трэба стварыць умовы, сярод якіх першая — актуалізацыя беларуска-ўзбекістанскай дагаворна-прававой базы (яна ўключае 60 міжнародных дагавораў і пагадненняў). Міхаіл Мясніковіч прапанаваў міжпарламенцкім і міжурадавым камісіям правесці гэтую работу на працягу 2019 і 2020 гадоў.

Другая важная ўмова актывізацыі двухбаковага супрацоўніцтва — гарманізацыя нацыянальных гандлёвых заканадаўстваў. «У цяперашні час краінавыя ўмовы істотна адрозніваюцца паміж сабой, што стрымлівае аб'ёмы ўзаемнага гандлю і інвестыцый. Парламентам і ўрадам мэтазгодна зняць існуючыя бар'еры», — выказаў меркаванне старшыня Савета Рэспублікі.

Яшчэ адным залогам паспяховага супрацоўніцтва ён назваў інвестыцыі. «Да таго часу, пакуль не будзе буйных сумесных кампаній, а лепш — фінансава-прамысловых груп, нашы эканамічныя адносіны не будуць такія ўстойлівыя, як хацелася б, — лічыць Міхаіл Мясніковіч. — Толькі сумесны бізнес, магчыма і з удзелам кампаній з трэціх краін, можа стаць драйверам актыўнага развіцця».

Спікер канстатаваў, што ў Беларусі і Узбекістана пакуль мала буйных сумесных кампаній, а тыя, што ёсць, маюць цяжкасці з-за тарыфнага і нетарыфнага рэгулявання. «Сітуацыю не варта драматызаваць. Над гэтымі пытаннямі трэба сумесна працаваць і дыпламатам, і парламентарыям, і, у першую чаргу, мацярынскім кампаніям. І мы ўпэўненыя, што ўзаемавыгадныя рашэнні будуць выпрацаваны», — адзначыў Міхаіл Мясніковіч.

Ён таксама выступіў за тое, каб Беларусь і Узбекістан рэалізоўвалі больш інавацыйных праектаў. «Без навукі, даследаванняў, уласных навукова-тэхнічных і адукацыйных праграм немагчыма дасягнуць высокай канкурэнтаздольнасці», — рэзюмаваў кіраўнік верхняй палаты парламента.

Пры гэтым важна падключаць моладзь і прыслухоўвацца да яе меркавання, лічыць парламентарый: «Яны будуюць сваю будучыню, і органы ўлады абавязаны ім дапамагчы».

Міхаіл Мясніковіч падкрэсліў, што ў Беларусі створаны прывабны інвестыцыйны і падатковы клімат, дзейнічае шэраг прэферэнцыйных рэжымаў і свабодных эканамічных зон. «Беларусь можа стаць для ўзбекскага бізнесу добрай пляцоўкай для выхаду на рынкі Еўразаюза, — заўважыў ён. — Мы ўдзячныя ўзбекскім партнёрам за запрашэнне беларускіх кампаній да шырокага ўзаемадзеяння, удзелу ў новых сумесных праектах, стварэнне магчымасці па сумесным выхадзе на рынкі краін Цэнтральнай Азіі».

Супадаюць у нашых краінах і прыярытэты ў супрацоўніцтве з Кітаем, дадаў Міхаіл Мясніковіч. Ён прапанаваў абмеркаваць сумяшчэнне намаганняў у рамках глабальнай ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях».

Безумоўна, асноўным рухавіком супрацоўніцтва павінны стаць эфектыўныя рэгіянальныя праекты, менавіта дзеля іх старту і задуманы форум. «Беларускія рэгіёны маюць досыць шырокія паўнамоцтвы для самастойнага прыняцця рашэнняў па ўсім коле пытанняў», — падкрэсліў спікер.

Нарэшце, менавіта парламентам адведзена важная роля ў наладжванні стасункаў паміж краінамі, і падчас работы форуму ўдалося знайсці механізмы паглыблення міжпарламенцкага супрацоўніцтва, паведаміў сенатар.

Абноўлены Узбекістан адкрываецца для інвестараў

Са станоўчай папярэдняй ацэнкай І Форуму рэгіёнаў Беларусі і Узбекістана пагадзіўся і **першы намеснік старшыні Сената Олій Мажліса Узбекістана, старшыня арганізацыйнага камітэта форуму з боку гэтай краіны Садык САФАЕЎ.**

«Праведзеная сумесна дбайная падрыхтоўка дазволіла забяспечыць высокі ўзровень прадстаўніцтва, плённасць праведзеных на палях форуму перагавораў. Дастаткова адзначыць, што ў яго рабоце бяруць удзел больш за 200 прадстаўнікоў Узбекістана, у тым ліку парламентарыі, кіраўнікі абласцей, буйных прадпрыемстваў, прадпрымальнікі, прадстаўнікі навукова-акадэмічных колаў. Гэта падкрэслівае сур'ёзны настрой на сумесную работу з беларускімі партнёрамі», — сказаў ён.

Садык Сафаеў адзначыў вялікую ўзаемную цікавасць, магутны патэнцыял супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі і, у прыватнасці, іх рэгіёнамі. Для Узбекістана супрацоўніцтва з Беларуссю з'яўляецца важным прыярытэтам знешняй палітыкі. «Мы цвёрда перакананыя, што паслядоўнае развіццё і ўсебаковае ўмацаванне партнёрскіх сувязяў па ўсім спектры адносін цалкам адпавядаюць інтарэсам абедзвюх краін і народаў», — падкрэсліў віцэ-спікер.

Парламентарый паведаміў пра сутнасць палітычнай і эканамічнай мадэрнізацыі сваёй краіны, узрастанне ролі парламента ў жыцці Узбекістана. Цягам двух апошніх гадоў тэмпы эканамічнага росту ў краіне былі вышэйшыя за сярэднія ў свеце, у першай палове 2019 года гэты паказчык склаў 5,3 працэнта. «Сёння Узбекістан дэманструе прадказальнасць, адкрытасць, гатоўнасць да дыялогу», — запэўніў Садык Сафаеў.

Дасягнуты ўзровень узбекістанска-беларускіх сувязяў шмат у чым грунтуецца на асабістых даверных адносінах паміж прэзідэнтамі дзвюх краін, падкрэсліў сенатар. Ён назваў прарыўным у двухбаковых адносінах леташні візіт Аляксандра Лукашэнкі ва Узбекістан.

«Форум стаў важным крокам у прасоўванні дзелавога супрацоўніцтва, рэалізацыі канкрэтных праектаў ва ўзаемадзеянні рэгіёнаў Узбекістана і Беларусі, — упэўнены віцэ-спікер. — Ён адкрыў новыя гарызонты ўзаемадзеяння ў такіх галінах, як прамысловая кааперацыя, аграпрамысловы комплекс, харчовая прамысловасць, а таксама ў культурнай, гуманітарнай, інфармацыйна-камунікацыйнай і навуковай сферах. Падпісаны сумесныя дакументы, будуць створаны сумесныя прадпрыемствы. Праведзеныя падчас форуму плённыя перагаворы стануць трывалай асновай для далейшага павелічэння абʼёмаў узаемнага гандлю і пашырэння наменклатуры тавараў».

Паводле яго слоў, цяпер відавочна, наколькі своечасовае і прадуктыўнае было ўключэнне такога раней не задзейнічанага магутнага пласта двухбаковага ўзаемадзеяння, як прамое супрацоўніцтва рэгіёнаў.

«Нас асабліва радуе тое, што сістэматычны характар набыў узбекска-беларускі міжпарламенцкі дыялог, які з'яўляецца важным рэсурсам паглыблення адносін паміж бакамі», — дадаў Садык Сафаеў.

Дарожная карта

Пашырэнне міжрэгіянальных сувязяў разглядаецца Беларуссю ў якасці важкага ўкладання ва ўмацаванне трывалага фундамента, на якім цяпер будуецца і атрымае развіццё ў далейшым увесь комплекс беларуска-ўзбекскіх адносін. Пра гэта на пленарным пасяджэнні заявіў **першы намеснік міністра замежных спраў Беларусі Андрэй ЕЎДАЧЭНКА.**

Праграмным дакументам па развіцці двухбаковага эканамічнага супрацоўніцтва з'яўляецца дарожная карта, якая ўтрымлівае больш за 150 мерапрыемстваў у розных сектарах эканомікі.

Значную частку гэтай карты займае гандаль. За апошнія два гады аб'ём двухбаковага тавараабароту Беларусі і Узбекістана вырас амаль у два з паловай разы (у 2018 годзе ён склаў 157,4 мільёна долараў) і за пяць месяцаў бягучага года дадаў у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага яшчэ 15 працэнтаў. Пры гэтым больш чым у 13 разоў вырас аб'ём узаемнага гандлю паслугамі (за пяць сёлетніх месяцаў — каля 60 мільёнаў долараў).

«Мы цяпер актыўна працуем над тым, каб наблізіць беларускія тавары да ўзбекскага спажыўца, — расказаў першы намеснік міністра замежных спраў Беларусі. — Ды і беларусы маюць патрэбу ў якасных узбекскіх таварах: фруктах, гародніне, арэхах. Асабліва гэта актуальна для тых, хто трымаецца здаровага ладу жыцця, а такіх у нашай краіне ўсё больш».

Каля 30 пунктаў дарожнай карты датычацца развіцця інвестыцыйнай дзейнасці і вытворчай кааперацыі. Прыярытэтныя кірункі: машынабудаванне, аграпрамысловы комплекс, харчовая, фармацэўтычная, лёгкая прамысловасць, транспарт, інфармацыйныя тэхналогіі.

«Мы ўсе разумеем, што гэта цалкам новы этап беларуска-ўзбекскіх адносін, новая якасць нашага эканамічнага супрацоўніцтва, — сказаў Андрэй Еўдачэнка. — Размова ідзе пра стварэнне адносна буйных прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. Напрыклад, у межах сумеснага праекта Мінскага трактарнага завода і Ташкенцкага завода сельскагаспадарчай тэхнікі мы прапануем арганізаваць сумесную вытворчасць трактароў — каля пяці тысяч адзінак у год».

У рамках створанага ў сёлетнім красавіку сумеснага прадпрыемства «Здравушка-Ташкент» плануецца адкрыць завод па перапрацоўцы малака магутнасцю 50 тон у суткі і малочнатаварны комплекс на тысячу галоў.

Па словах прадстаўніка знешнепалітычнага ведамства Беларусі, цяпер абмяркоўваюцца пытанні не проста зборкі, а поўнамаштабнай вытворчасці з выкарыстаннем мясцовай сыравіны, матэрыялаў, камплектуючых, укараненнем паэтапнай лакалізацыі, сумесным кіраваннем вытворчасцю і правядзеннем узгодненай маркетынгавай палітыкі, у тым ліку ў пытаннях прасоўвання сумесна выпрацаванай прадукцыі на рынкі трэціх краін.

Да таго ж пад рэалізацыю сумесных беларуска-ўзбекскіх праектаў падводзіцца адпаведная навуковая база, паведаміў Андрэй Еўдачэнка. Добрыя перспектывы маюцца ў рэалізацыі ідэй па стварэнні ў Ташкенцкай вобласці селекцыйна-генетычнага цэнтра па буйной рагатай жывёле і ўкараненні сістэмы ідэнтыфікацыі сельскагаспадарчых жывёл.

* * *

Падводзячы для журналістаў папярэднія вынікі праведзенай сумеснай работы, віцэ-спікер верхняй палаты беларускага парламента Мар'яна Шчоткіна назвала І Форум рэгіёнаў Беларусі і Узбекістана гістарычнай падзеяй. Яго правядзенне было палітычнай воляй двух прэзідэнтаў, нагадала яна. «Мэта — перш за ўсё ўмацаванне міжпарламенцкага супрацоўніцтва і ўмацаванне і пашырэнне міждзяржаўнага супрацоўніцтва, — заявіла Мар'яна Шчоткіна. — У нас розныя дзяржавы, розныя эканомікі, але не канкурэнцыя, а ўзаемадапаўненне і супрацоўніцтва ляжаць у аснове нашага ўзаемадзеяння».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

ПАТЭНЦЫЯЛ НА МІЛЬЯРД

Перспектывы двухбаковых стасункаў у гуманітарнай, інфармацыйна-камунікацыйнай і навуковай сферах абмеркавалі ўдзельнікі форуму на базе НАН Беларусі

Мадэратарамі работы тэматычнай секцыі з беларускага боку выступілі старшыні профільных камісій Савета Рэспублікі Сяргей Рахманаў і Віктар Сірэнка, з узбекскага — старшыня камітэта Сената Олій Мажліса па пытаннях навукі, адукацыі і аховы здароўя Зайнідзін Нізамхаджаеў.

Пляцоўка для канструктыўнага дыялогу

Цэлы шэраг прарыўных праектаў на карысць эканомік і народаў дзвюх краін можна рэалізоўваць, аб'яднаўшы навуковы і вытворчы задзел Беларусі і Узбекістана. Гэтая думка гучала неаднаразова ў выступленнях спікераў, у рамках работы тэматычнай секцыі.

Як адзначыў Зайнідзін Нізамхаджаеў, форум з'яўляецца выдатнай пляцоўкай для канструктыўнага дыялогу дзвюх краін. Вынікам рэформаў, якія праводзяцца ва Узбекістане, паводле яго слоў, становіцца пашырэнне супрацоўніцтва з многімі краінамі, асабліва з тымі, што ўваходзяць у СНД. За кароткі прамежак часу на самым высокім узроўні ўдалося дамовіцца аб развіцці з Беларуссю парламенцкіх адносін, гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, развіцці атамнай энергетыкі, а таксама культурна-гуманітарнай сферы. Так, Гандлёва-прамысловай палатай у 2018 годзе былі падпісаны дагаворы па дзевяці кірунках на агульную суму больш за 14 мільёнаў долараў.

— Сённяшні форум, скіраваны на развіццё супрацоўніцтва ў гуманітарнай, інфармацыйна-камунікацыйнай і навуковай сферах, пашырэнне міжрэгіянальнага супрацоўніцтва, стане плённым як для Узбекістана, так і для Беларусі, — выказаў упэўненасць узбекскі парламентарый.

Ужо сёння рэалізуецца шэраг сумесных праектаў у розных кірунках дзейнасці. Як расказаў **старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзімір ГУСАКОЎ,** 15 сумесных праектаў ужо прынятыя да фінансавання, 11 з іх па матэрыялазнаўстве, біялогіі, фізіцы і іншых галінах, дзе задзейнічаны айчынныя арганізацыі НАН. Праводзяцца і асобныя кірункі ў рамках рэалізацыі дарожнай карты супрацоўніцтва: напрыклад, па стварэнні на тэрыторыі Узбекістана сучаснай МТФ на 1000 галоў жывёлы, уключэнні васьмі сартоў бульбы беларускай селекцыі ў дзяржаўны рэестр гэтай цэнтральнаазіяцкай краіны, выкарыстанні магчымасцяў беспілотных лятальных апаратаў, напрацовак у галіне фармацэўтыкі і ў іншых сферах дзейнасці.

Больш падрабязна пра развіццё навукова-тэхнічнай і інавацыйнай сферы ў нашай краіне паведаміў **намеснік старшыні Дзяржкамітэта па навуцы і тэхналогіях Беларусі Сяргей ШЧАРБАКОЎ.** Інавацыйная інфраструктура ў Беларусі актыўна развіваецца. Сёння яна складаецца з 16 навукова-тэхнічных паркаў, дзевяці цэнтраў трансферу тэхналогій, навукова-вытворчых цэнтраў і холдынгаў у структуры НАН і галіновых міністэрстваў. Штогод у нашай краіне ствараецца тры-пяць інавацыйных сусветнага ўзроўню. Якія значныя інавацыйныя распрацоўкі можна вылучыць?

> Беспрэцэдэнтныя меры па ўвядзенні бязвізавага рэжыму на асобных тэрыторыях краіны — унікальны вопыт, якім беларускі бок гатовы падзяліцца. Менавіта ён паўплываў на рост патоку замежных турыстаў на 50 % за апошнія паўтара года.

Напрыклад, дзевяць беларускіх фізікаў уваходзяць у лік суаўтараў адкрыцця базона Хігса. Гэта адно са значных дасягненняў сучаснай фундаментальнай фізікі. Распрацавана ўнікальная сістэма для вызначэння канцэнтрацыі праанкагену ва ўзорах тканак у рэжыме рэальнага часу. Штучны сардэчны клапан сусветнага класа, кошт якога ў пяць разоў меншы за кошт аналагаў, створаны ў Беларусі. Ёсць і іншыя значныя распрацоўкі.

Штучны інтэлект спатрэбіцца...

Вельмі плённай з узаемнага пункту гледжання бачыцца сумесная работа ў ІТ-сферы. Як расказаў **генеральны дырэктар Тэхналагічнага парка праграмных прадуктаў і інфармацыйных тэхналогій Фархід ІБРАГІМАЎ,** у краіне створаны беспрэцэдэнтныя меры па прыцягненні замежных партнёраў у якасці рэзідэнтаў ІТ-парка. У прыватнасці, падаходны падатак у памеры 7,5 %, нулявы карпаратыўны падатак, адсутнасць адзіных сацыяльных выплат, магчымасць разлічвацца з працаўнікамі ў замежнай валюце, а таксама адсутнасць мытных плацяжоў пры імпарце тавараў для ўласных патрэб.

У сваю чаргу **дырэктар па развіцці бізнесу кампаніі InData Labs Сяргей РАБАТАЙ** падзяліўся вопытам работы кампаніі ў вобласці штучнага інтэлекту. На сённяшні дзень беларуская каманда распрацоўвае розныя рашэнні, якія дазваляюць

у лічаныя долі секунды аналізаваць велізарную колькасць даных, што дапамагае заказчыку правільна выбіраць бізнес-мадэль паводзін і ўплывае на павелічэнне прыбытку кліента. Спецыялісты кампаніі могуць прапанаваць унікальныя праекты па такіх кірунках дзейнасці, як камп'ютарны зрок (пабудова трохмерных малюнкаў), работа з мовай (галасавым памочнікам), работа з натуральным тэкстам і магчымасць з дапамогай наяўных даных будаваць мадэль паводзін.

— 33 мільёны чалавек (насельніцтва Узбекістана. — **Аўт.**) — гэта велізарная колькасць даных, з якімі можна працаваць і рабіць цікавыя рашэнні, — ацаніў ён перспектывы магчымых сумесных праектаў.

Будучыня — за ведамі!

Перспектывы ў сферы адукацыі прадставіў **рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Вадзім БОГУШ.** Імпульсам да супрацоўніцтва, паводле яго слоў, паслужыла падпісанне адпаведнага дагавора паміж БДУІР і Ташкенцкім універсітэтам інфармацыйных тэхналогій, які лёг у аснову стварэння сумеснага факультэта. Больш за 200 узбекскіх студэнтаў з 1 верасня будзе вучыцца па схеме «2+2» (2 гады ва Узбекістане, 2 — у Беларусі).

> Цэлы шэраг прарыўных праектаў на карысць эканомік і народаў дзвюх краін можна рэалізоўваць, аб'яднаўшы навуковы і вытворчы задзел Беларусі і Узбекістана.

Акрамя таго, узбекскі бок праяўляе цікавасць да беларускага вопыту Акадэміі інфарматыкі для школьнікаў, які рэалізуецца ва ўніверсітэце. На думку рэктара, бакі маглі б выйсці на сумесныя навукаёмістыя праекты.

Унікальным вопытам работы міжнароднага ўніверсітэта з удзельнікамі пасяджэння падзяліўся **Музафар ДЖАЛАЛАЎ, рэктар універсітэта Інха ў Ташкенце.** Гэта першая карэйская ВНУ, якая функцыянуе за межамі Карэі і рыхтуе спецыялістаў ІТ-профілю. За пяць гадоў існавання ўніверсітэта колькасць студэнтаў павялічылася амаль у 11 разоў: са 120 да 1300 чалавек.

Паводле яго слоў, развіццю сферы адукацыі ў краіне аддаюць вялікая ўвага: за апошнія гады колькасць ВНУ выраслa на траціну і склала 111, з іх каля 20 даюць адукацыю міжнароднага ўзору, каля 25 — у сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

У сваю чаргу, **рэктар Беларускай акадэміі сувязі Андрэй ЗЯНЕВІЧ** паведаміў, па якіх кірунках супрацоўніцтва бачыцца аб'яднанне намаганняў у адукацыйнай сферы, у прыватнасці па распрацоўках сістэм «Разумны дом», «Разумная паштовая скрыня», квантавай сістэмы для гарантаванай абароны оптавалакна і іншых цікавых напрацоўках беларускага боку.

Ацаніць гасціннасць

Сфера турызму — адна з перспектыўных кірункаў развіцця міжрэгіянальнага супрацоўніцтва паміж Узбекістанам і Беларуссю. Турыстычны патэнцыял

Чулі?

Амаль што «Фердынанд»

Гэтым летам можна ўбачыць сталіцу з вокнаў легендарнага аўтобуса ЗІС-8 — такія ў Савецкім Саюзе выпускалі ў 30-я гады мінулага стагоддзя.

Як выглядаў транспартны сродак? Перагледзьце фільм «Месца сустрэчы змяніць нельга» — там-тэйшы «Фердынанд» і ёсць той самы аўтобус, праўда, сабраны наноў уручную. Да нашых дзён ніводная з машын не захавалася, бо корпус іх выраблялі з дрэва і праз пэўны час зношваўся ўшчэнт. Але ў Мінску энтузіясты за 1,5 года сабралі дакладную рэпліку ЗІС-8 з дубовымі лаўкамі і рассоўнымі вокнамі і запрасілі гасцей і жыхароў сталіцы на экскурсіі.

Як бачым, пунктаў судакранання ў бакоў дастаткова шмат, у розных сферах і па розных кірунках, каб цяперашнія 157 мільёнаў долараў узаемнага тавараабароту павялічыць да мільярда.

Вольга АНУФРЫЕВА.
Фота Канстанціна ДРОБАВА.

БОЛЬШ, ЧЫМ ДВУХБАКОВАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Сельскагаспадарчая эліта Беларусі і Узбекістана абмеркавала перспектыўныя кірункі ўзаемадзеяння

Пытанні двухбаковых гандлёвых стасункаў, супрацоўніцтва ў галінах раслінаводства, племянной жывёлагадоўлі і ветэрынарыі, аграрнай адукацыі былі абмеркаваны на тэматычнай секцыі.

Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Анатоль ХАЦЬКО вітаў гасцей па-ўзбекску, чым выклікаў шчырыя воплескі. Кіраўнік ведамства лічыць агрmaпрамысловыя комплексы важнымі галінамі эканомікі для абедзвюх краін, паколькі менавіта сельская гаспадарка адказвае за харчовую бяспеку краіны.

«Устойлівае развіццё вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі, харчовая бяспека — асноўныя кірункі макраэканамічнай палітыкі, якія патрабуюць асаблівай увагі. Гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі ў АПК апошнім часам няўхільна развіваецца», — з задавальненнем адзначыў Анатоль Хацько.

Тавараабарот сельскагаспадарчай прадукцыі і прадуктаў харчавання па выніках мінулага года ўзрос практычна на 60 % і дасягнуў 30 мільёнаў долараў. Наладжана цеснае супрацоўніцтва з Ташкенцкай вобласцю.

«Рэалізуецца праект па стварэнні ў гэтым рэгіёне цэнтра па племянной справе, распрацоўваецца канцэпцыя стварэння селекцыйна-генетычнага цэнтра, а таксама прадпрыемства па вытворчасці ветэрынарных прэпаратаў», — паведаміў міністр.

Па яго перакананні, адзін з асноўных складнікаў экспартнага патэнцыялу Беларусі ў сельскай гаспадарцы — высакаякасная малочная і мясная прадукцыя. У Беларусі ў апошняе дзесяцігоддзе цалкам перабсталяваны малочнатаварныя фермы і прадпрыемствы перапрацоўкі, укаранёныя сучасныя сістэмы кантролю якасці прадукцыі, нарошчаныя аб'ёмы вытворчасці, прадпрыемствы сертыфікуюцца на адпаведнасць патрабаванням стандарту «халяль».

КАНСАЛІДАВАЦЬ НАМАГАННІ

«Супрацоўніцтва ў апошнія гады пачало набываць новае напаўненне, другое дыханне. Мы маем намер, канешне, працягваць гэтую ўстойлівую і неабходную тэндэнцыю. Узбекістан разглядае Беларусь у якасці аднаго з ключавых партнёраў у галіне развіцця сельскай гаспадаркі», — адзначыў падчас пасяджэння секцыі **старшыня камітэта Сената Олій Мажліса Узбекістана па пытаннях міжнародных адносін, знешнеэканамічных сувязяў, замежных інвестыцый і турызму Алішэр КУРМАНАЎ.**

Ён паведаміў, што ў апошнія два гады Узбекістан здолеў значна актывізаваць супрацоўніцтва ў рэгіёне. Таму трэба бачыць не толькі адну дзяржаву, але і ўсю Цэнтральную Азію. Любая ініцыятыва, пачатая ва Узбекістане, не будзе абмяжоўвацца яго граніцамі, а пойдзе значна далей. Да таго ж замежныя партнёры карыстаюцца шырокім колам прэферэнцый і льгот.

Узбекістан, як і Беларусь, адчувае змяненні клімату, а таму патрабуе стварэння новых высокаўраджайных, устойлівых да розных хвароб і засухі сартоў бульбы.

«На планеце Зямля найлепшая нацыя, якая ўмее гэта рабіць, — беларусы», — выказаў упэўненасць Алішэр Курманаў.

У сферы селекцыі паміж Беларуссю і Узбекістанам ужо наладжаныя першыя кантакты: у Ташкенцкай вобласці праводзяцца тэхналагічныя іспыты васьмі сартоў бульбы і дваццаці сартоў культур агародніны.

Разам з тым старшыня камітэта з жалем адзначыў, што на шляху «шчаслівага шлюбу» паміж Беларуссю і Узбекістанам ёсць і некаторыя перашкоды, у тым ліку гандлёвыя абмежаванні. Таму асаблівую важнасць набывае рэжым свабоднага гандлю і ўмацаванне міжрэгіянальнага супрацоўніцтва.

Асаблівую зацікаўленасць узбекскія партнёры адчуваюць у тым ліку ў стварэнні інтэнсіўных садоў, цяплічных гаспадарак, магутнасцяў па перапрацоўцы плодаагароднінай прадукцыі, сучасных жывёлагадоўчых комплексаў і комплексаў па перапрацоўцы мяса-малочнай прадукцыі, машынна-трактарных паркаў.

«Калі кансалідаваць намаганні, можна будзе дасягнуць вялікіх поспехаў», — перакананы Алішэр Курманаў.

БАР'ЕРЫ ПЕРААДОЛЬНЫЯ

Па інфармацыі **намесніка міністра сельскай гаспадаркі Узбекістана Саідкамола ХАДЖАЕВА,** у сельскай гаспадарцы краіны выкарыстоўваецца больш за 20 мільёнаў гектараў зямель, плануецца дадаткова асвоіць 1100 гектараў — да чаго запрашаюць беларускіх партнёраў.

Тым больш што сыравіна, матэрыялы, запчасткі ці абсталяванне, якія не вырабляюцца ва Узбекістане, пры ўвозе на патрэбу землекарыстання вызваляюцца ад мытных плацяжоў.

«Нашы эканомікі не канкуруюць, а дапаўняюць адна адну. Разумеем, што розніца нацыянальных стандартаў на адну і тую ж прадукцыю — бар'ер на шляху да развіцця міжнароднага гандлю, таму зацікаўлены ў абмене данымі аб нацыянальных стандартах, тэхнічных рэгламентах і сумесных распрацоўках па бяспецы харчовай прадукцыі», — прапанаваў намеснік міністра.

Ён запрасіў таксама на выстаўку «Зроблена ва Узбекістане», каб пакаштаваць мясцовую прадукцыю. Вінаградарства — адзін з кірункаў сельскай гаспадаркі, што развіваецца ў гэтай краіне найбольш хутка. Саідкамол Хаджаеў прапанаваў і беларускаму боку запусціць сумесныя вінныя кластары ў цэнтральнаазіяцкай краіне.

ПРАДУКТЫ ДА ЎЗБЕКСКАГА СТАЛА

Беларусь са сваім развітым аграрным сектарам традыцыйна экспартуе каля 60 % малочнай і больш за 40 % мясной, у тым ліку ва Узбекістан. Пра гэта журналістам паведаміў **начальнік галоўнага ўпраўлення знешнеэканамічнай дзейнасці Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Аляксей БАГДАНАЎ.**

У Ташкенце працуе крама беларускіх тавараў, і асартымент беларускіх прадуктаў харчавання плануецца штогод пашыраць і павялічыць даходную частку на 800—900 тысяч долараў. Наш тавараабарот увогуле год ад году расце, прычым экспарт і імпарт — збалансаваныя.

«Вялікі патэнцыял у развіцці нашых паставак ва Узбекістан. Прааналізавалі імпарт Узбекістана і бачым: па тых кірунках, дзе ў нас ёсць перавытворчасць, можам накіраваць дадатковыя аб'ёмы. Гэта сухія малочныя прадукты, натуральнамалочная прадукцыя, мяса, племянная жывёла», — праінфармаваў Аляксей Багданаў.

> Узбекістан, як і Беларусь, адчувае змяненні клімату, а таму патрабуе стварэння новых высокаўраджайных, устойлівых да розных хвароб і засухі сартоў бульбы.

Беларусь пачала пастаўкі ва Узбекістан жывых коней, летась паставілі 275 галоў племянной жывёлы для развіцця малочнай жывёлагадоўлі ва Узбекістане, за паўгода 2019-га — ужо каля сотні галоў. Летась пачаліся і пастаўкі беларускай насеннай бульбы ва Узбекістан.

Цяпер рэалізуецца сумесны праект па стварэнні малочнатаварнага комплексу на тысячу галоў буйной рагатай жывёлы з цэхам перапрацоўкі, які будзе цалкам укамплектаваны беларускімі абсталяваннем і жывёлай. Працэс вытворчасці таксама будзе наладжаны па беларускіх тэхналогіях.

РУХ НАПЕРАД

Галоўная задача I Форуму рэгіёнаў Беларусі і Узбекістана — вызначыць аб'ёмы, якія краіны могуць закласці ў двухбаковае супрацоўніцтва, высветліць кірункі, па якіх далей ужо больш глыбока абмяркоўваць пытанні. Такую думку падчас работы секцыі выказаў Анатоль Хацько.

Стасункі на секцыі паслужылі ўмацаванню далейшага двухбаковага супрацоўніцтва Беларусі і Узбекістана ў аграпрамысловым комплексе, а прапановы і ідэі ў далейшым пойдуць у дарожную карту адносін дзвюх краін.

Варвара МАРОЗАВА,
фота аўтара.

НЕ КАНКУРЭНЦЫЯ, А КААПЕРАЦЫЯ

Фота Наталлі КАВАЛЁВАЙ.

Першы Форум рэгіёнаў Беларусі і Узбекістана аказаўся вельмі плённым. Як зазначыла намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Мар'яна Шчоткіна, бакі заключылі 26 прамых пагадненняў. Падзея сапраўды гістарычная.

Па выніках мінулага года аб'ём тавараабароту паміж нашымі краінамі склаў крыху больш за 157 мільёнаў долараў. Але прамысловая кааперацыя абяцае вялікі патэнцыял. У тым ліку — дзякуючы адкрыццю сумесных рынкаў. Падчас адпаведнай секцыі, якая прайшла на базе Мінскага трактарнага завода, гучалі планы адносна павелічэння сумы ўзаемнага гандлю да мільярда долараў.

— Рашэнне аб правядзенні Форуму рэгіёнаў з'яўляецца сведчаннем таго, што ёсць пытанні, якія трэба абмяркоўваць як на найвышэйшым узроўні ўлады, так і бізнесу, — лічыць **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Андрэй РЫБАК.** — Упэўнены, што ў будучыні ён будзе толькі пашырацца. Канцэпцыяй форуму абазначана, што ключавым фактарам развіцця міждзяржаўных адносін з'яўляецца супрацоўніцтва рэгіёнаў. Гэта дапамагае нам зразумець, што кожны паспяхова рэалізаваны інвестыцыйны праект і заключаная дамова прынясе канкрэтную карысць для грамадзян Беларусі і Узбекістана. Гэта новыя рабочыя месцы, павышэнне даходаў, паляпшэнне сітуацыі ў рэгіёнах і, як следства, упэўненасць у заўтрашнім дні. Таму падтрымка гандлёва-эканамічных сувязяў у гэтым кірунку вельмі важная. З гэтай нагоды хачу сказаць, што летась 2 лістапада прэм'ер-міністры Беларусі і Узбекістана падпісалі дарожную карту супрацоўніцтва. Яна ўключала ў сябе больш за 100 мерапрыемстваў для развіцця двухбаковага гандлю таварамі і паслугамі, забеспячэння на ўзаемнай аснове доступу на рынкі бакоў, узаемадзеяння ў сферы прамысловай кааперацыі, сельскай гаспадаркі, лёгкай прамысловасці, фармацэўтыкі і аховы здароўя, будаўніцтва, нафтахіміі, энергетыкі.

— Эканомікі дзвюх краін не канкуруюць паміж сабой, — зазначыў **старшыня камітэта Заканадаўчай палаты Олій Мажліса Узбекістана па пытаннях інавацыйнага развіцця, інфармацыйнай палітыкі і інфармацыйных тэхналогій Ілхом АБДУЛАЕЎ.** — Напрыклад, сельская гаспадарка Беларусі і Узбекістана выпускае розныя віды прадукцыі. Мы адна з ключавых дзяржаў Цэнтральнай Азіі. Узбекістан мог бы стаць хабам беларускай прадукцыі для пастаўкі яе на ўвесь наш рэгіён.

У сваю чаргу, Узбекістан зацікаўлены ў аналагічнай транспартна-лагістычнай інфраструктуры, якая маецца ў Беларусі. Цэнтральнаазіяцкая краіна хацела б развіваць кантакты з намі ў сферы адукацыі, культуры і агарапрамысловага комплексу.

Скіраванасць на лакалізацыю

Намеснік міністра эканомікі і прамысловасці Узбекістана Сахіб САІФНАЗАРАЎ адзначыў, што геаграфічныя ўмовы Узбекістана дазваляюць ствараць шмат вытворчасцяў, і краіна паспяхова гэта робіць. У тым ліку — і сумесныя з Беларуссю.

— Цяпер у нас 59 сумесных прадпрыемстваў. Пры гэтым мушу сказаць, што Узбекістан мае намер адысці ад «адвёрткавай» вытворчасці і скіравацца на больш глыбокую лакалізацыю. Разам з тым ёсць кірункі, у якіх мы б маглі развіваць з Беларуссю прамысловую кааперацыю. Гэта электратэхніка, тэкстыльная вытворчасць, харчовы сектар... Агулам мы маем намер заключыць кантракты на суму не менш за 200 мільёнаў долараў у эквіваленце.

Наша тэхніка паедзе ў Пакістан?

Дарадца прэм'ер-міністра Узбекістана, **старшыня праўлення АТ «Узагратэхсанаатхолдынг» Надзір АТАЖОНАЎ** адзначыў, што два бакі маюць намер заключыць пагадненне аб прамысловай кааперацыі прадпрыемстваў, якія выпускаюць сельскагаспадарчую і камунальную тэхніку. Узбекскі бок хацеў бы бачыць у гэтым пераліку «Амкадор», «Гомсельмаш», Мінскі маторны завод і МТЗ. Датычна апошняга ішлі перамовы аб тым, каб выпускаць ва Узбекістане трактары з высокім узроўнем лакалізацыі. Прадукцыю плануецца пастаўляць на рынак Пакістана і Афганістана. Пагадненне з «Гомсельмашам» важнае таму, што Узбекістан жадае павялічыць узровень механізацыі жывёлагадоўлі. А для гэтага з канвеера будзе сыходзіць шырокі асартымент прадукцыі.

— Для нас вельмі запатрабаваны назапашаны гадамі беларускі досвед, — кажа Надзір Атажонаў. — Мы зацікаўлены ў тым, каб гэтыя пагадненні мелі працяглы характар.

> Наша аўтатэхніка будзе запатрабавана ва Узбекістане. У гэтай дзяржаве зараз будуюць шмат дарог і жылля. Геаграфічнае становішча краіны таксама выгаднае — праз яе праходзіць некалькі транскантынентальных лагістычных шляхоў.

У сваю чаргу, **намеснік міністра прамысловасці Беларусі Аляксандр АГАРОДНІКАЎ** таксама акрэсліў прыярытэтныя кірункі кааперацыі. Пашыраць сваю прысутнасць на рынку Узбекістана плануюць МАЗ, МТЗ. Вядуцца перагаворы па праектах, якія маюць намер рэалізаваць ва Узбекістане «Амкадор» і «Гомсельмаш».

Узбекская спецтэхніка на шасі МАЗа

У цэнтральнаазіяцкай краіне працуе замежнае прадпрыемства «МАЗ-Ташкент». Пра першыя вынікі расказаў **дырэктар арганізацыі Валерый ЖЫГУНОЎ.**

— 13 верасня 2018 года было падпісана пагадненне аб стварэнні сумеснай вытворчасці, і ўжо 15 верасня былі пастаўлены першыя шасі для спецтэхнікі. Мы пачалі вытворчасць паводле дамоўленасцяў і ў рамках выканання дарожнай карты па эканамічным развіцці двухбаковых адносін Узбекістана і Беларусі. Мы працуем сумесна з заводам KRANTAS па выпуску спецтэхнікі, які з'яўляецца найбуйнейшым у рэгіёне. Праект быў запушчаны па даручэнні прэзідэнта Узбекістана. Адбылося гэта пасля заключэння пагаднення з прадпрыемствам па выніках выстаўкі Made in Belarus.

Наша аўтатэхніка будзе запатрабавана ва Узбекістане. У гэтай дзяржаве зараз будуюць шмат дарог і жылля. Геаграфічнае становішча краіны таксама выгаднае — праз яе праходзіць некалькі транскантынентальных лагістычных шляхоў.

— Але самая галоўная каштоўнасць — гэта людзі, — працягвае Валерый Жыгуноў. — Ва Узбекістане цяпер — 33 мільёны чалавек, якія хочуць жыць, працаваць і зарабляць, якім трэба карміць сем'і. У сваю чаргу, стварэнне сумесных зборачных прадпрыемстваў з вялікай лакалізацыяй пацягне за сабой вялікую кадравую падрыхтоўку. Сярод іншага, патрэбна стварыць сэрвісныя цэнтры з кваліфікаваным персаналам. Сёння ў кожным раёне Узбекістана створаны сэрвісны цэнтр МАЗа. Разам з тым мы прапануем не толькі пастаўляць сваю тэхніку ў рэгіёны. Дасягнута пагадненне аб стварэнні рабочай групы аб пастаўцы кампанентаў, якія робяцца ва Узбекістане, на канвеер МАЗа. Сёння некаторыя з іх ужо выпрабоўваюцца — аўташкло, акумулятары, радыятары, фары... Большасць з іх зроблена на прадпрыемствах з карэйскімі інвестыцыямі.

...і лекі

Зараз у цэнтральнаазіяцкай дзяржаве ствараецца сумеснае беларуска-ўзбекскае фармацэўтычнае прадпрыемства. Адгрузка прадукцыі стартуе налета.

Холдынг «Белфармпрам», агенцтва па развіцці фармацэўтычнай галіны пры Міністэрстве аховы здароўя Узбекістана і ТАА Fagusal (кампанія займаецца рэалізацыяй аптовай фармацэўтычнай і медыцынскай прадукцыі) падпісалі ў Мінску на палях І Форуму рэгіёнаў Беларусі і Узбекістана дагавор аб супрацоўніцтве. Падрабязней пра кааперацыю ў гэтай сферы расказаў **выконваючы абавязкі дырэктара кіруючай кампаніі холдынга «Белфармпрам» Віктар ШЭІН.**

— Наш транснацыянальны і стратэгічны праект скіраваны на стварэнне сумеснага прадпрыемства па вытворчасці лекаў у выглядзе таблетак і капсул. Прадукцыю мяркуем пастаўляць у трэція краіны. Напрыклад, у Афганістан. Увогуле, праект цікавы многім беларускім вытворцам і патрабуе дакладна вывераных падыходаў па стварэнні прамысловых магутнасцяў. Лічыце самі: з нашага боку ўключылася спачатку шэсць прадпрыемстваў, потым дзевяць, цяпер іх ужо 11. Таму, каб правільна пабудаваць бізнес-план, мы павінны ўлічыць пажаданні ўсіх вытворцаў. Наменклатура паўплывае на тое, якое менавіта будзе ўстанаўлівацца абсталяванне. Наш праект можна назваць унікальным. На прадпрыемстве будуць рабіць лекі тыя прадпрыемствы, якія зараз напрамую пастаўляюць іх з Беларусі ва Узбекістан. Такім чынам, мы павялічым сваю прысутнасць у гэтай краіне.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

ЧЫМ БАГАТЫ?

АД «БУСЛА» ДА ДУХМЯНЫХ БУЯКОЎ

Выстаўку беларускіх навуковых дасягненняў з «прыцэлам на ўсход» прадставілі ў Акадэміі навук

Хол Прэзідыума НАН Беларусі на гадзіну ператварыўся ў шумны ўсходні базар! Перад пасяджэннем тэматычнай секцыі тут разгарнулася выстаўка інавацыйных распрацовак пад маркай Made in Belarus: ад вынікаў працы селекцыянераў да проціпухлінных прэпаратаў.

ЯК З КУСТА!

Самую вялікую цікавасць, вядома, выклікаюць стэнды, дзе можна не толькі паглядзець-памацаць, але і пакаштаваць нешта на смак. У нашым выпадку гэта быў стэнд Цэнтральнага батанічнага саду НАН Беларусі з рознымі гатункамі садовых буякоў. Тэхналогію масавага размнажэння і вырошчвання гэтай нетрадыцыйнай ягады прапанавалі ўкараніць ва ўмовах спякотнага ўзбекскага клімату, а заадно ацаніць смак гатовага прадукту... васьмі (!) відаў. Як расказаў прадстаўнік Батанічнага саду, ураджайнасць з аднаго куста дасягае пяці кілаграмаў.

Побач красаваўся вынік традыцыйнага беларускага земляробства — бульба сартоў «Маніфест», «Брыз» і «Палац».

НПЦ НАН Беларусі па харчаванні прапануваў ацаніць высокую якасць беларускай прадукцыі, ад малочных прадуктаў да дзіцячага харчавання.

Цэнтр святлодыёдных і оптаэлектронных тэхналогій дэманстраваў вынікі сваёй працы на... расадзе базіліка. Менавіта мяккае святло ад святлодыёдаў станоўча ўплывае на інтэнсіўнасць росту раслін.

— Для вялікай дэлегацыі Узбекістана трэба хоць крышку інфармацыі менавіта практычнага характару, і для нас важна сканцэнтравана прадставіць усе нашы патэнцыйныя магчымасці, усе яркія фарбы навуковага свету і плюсы навукова-тэхнічнага прагрэсу, які існуе ў Беларусі — не толькі на словах, а рэальна нашы патэнцыйныя магчымасці, нашы дасягненні, — адзначыў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар СІРЭНКА.**

У ПОЛІ ЗРОКУ

Беспілотнікі «Бусел» таксама не засталіся па-за ўвагай: яны шматфункцыянальныя па магчымасцях свайго выкарыстання (ад аховы дзяржаўнай граніцы да аэрафотаздымкі і пошуку браканьераў). А яшчэ іх выпуск можна асвоіць на базе сумесных вытворчасцяў — пра такую магчымасць таксама ішла размова на тэматычным стэндзе.

Навукова-тэхнічныя распрацоўкі ў харчовай, фармацэўтычнай і нават касмічнай прамысловасці былі прадэманстраваны ва ўсёй сваёй разнастайнасці, зрэшты, як і турыстычны патэнцыял краіны.

— Выстаўка арыентавана на тое, каб паказаць узровень распрацовак, якія існуюць у Беларусі (галоўным чынам з пункту гледжання магчымасці іх адаптацыі і прымянення ва Узбекістане, і не толькі ў плане абмену, гандлю, але і ў плане рэальнай кааперацыі), — падкрэсліў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАХМАНАЎ.** — Таму большасць прадстаўленых распрацовак, мы разлічваем, знойдзе практычнае выкарыстанне, і мы зможам працаваць разам, у тым ліку і на знешнім контуры — прадаваць нашу прадукцыю за мяжу.

ПЛЁН АД СУПРАЦОЎНІЦТВА

Шахло МІРАЛІМАВА, намеснік дырэктара па навуцы Інстытута мікрабіялогіі Акадэміі навук Рэспублікі Узбекістан, паведаміла пра пачатак рэалізацыі сумеснага з беларускімі калегамі праекта з выкарыстаннем наначасціц пераходных металаў, сінтэзаваных бактэрыямі, у якасці спецыфічных мадулятараў. Работа над праектам знаходзіцца на пачатковай стадыі, але ўжо на гэтым этапе вучоная адзначае высокі прафесіяналізм беларускіх калег і іх адказны падыход да справы.

— Мы вельмі добра разумеем адно аднаго і знаходзім агульныя пункты ўзаемадзеяння, — адзначыла яна. — Упэўнена, што наш сённяшні візіт адкрыў вялікія перспектывы да далейшага супрацоўніцтва: я, напрыклад, знайшла шмат арганізацый, з якімі мы зможам далей плённа працаваць разам.

Вольга АНУФРЫЕВА. Фота Канстанціна ДРОБАВА.

Дні культуры, бізнес-форумы і сумесныя трэніроўкі

Дзве сталіцы — Мінск і Ташкент — стануць бліжэйшыя

Хакіміят Ташкента і Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт для рэалізацыі пагаднення аб гандлёва-эканамічным, навукова-тэхнічным і культурным супрацоўніцтве падпісалі план мерапрыемстваў на 2019–2020 гады, паведамляе БелТА.

У прыватнасці, на гэты час гады запланавана правядзенне Дзён Ташкента ў Мінску і Дзён Мінска ў Ташкенце з арганізацыяй выставак прадукцыі і паслуг, прэзентацыямі прамысловага і турыстычнага патэнцыялу гарадоў.

Што датычыцца эканамічнага ўзаемадзеяння, то плануецца правесці бізнес-форумы, сустрэчы, канферэнцыі, сімпозіумы, выстаўкі, кірмашы, перагаворы прадстаўнікоў дзелавых колаў. Бакі будуць абменьвацца інфармацыяй аб выставачных мерапрыемствах, садзейнічаць усталяванню партнёрскіх і эканамічных сувязяў у галіне тавараў і паслуг. Запланаваны форум маладых прадпрымальнікаў.

Бакі дамовіліся аб абмене перадавым вопытам і для развіцця спорту: пройдуць семінары, спаборніцтвы і сумесныя спартыўныя трэніроўкі, у тым ліку па алімпійскіх відах спорту.

У сферы адукацыі плануецца абменьвацца дэлегацыямі педагогаў устаноў агульнай і дадатковай адукацыі, арганізоўваць паездкі дэлегацый Мінска і Ташкента. Будзе развівацца супрацоўніцтва агульнаадукацыйных устаноў у галіне мастацка-эстэтычнага выхавання навучэнцаў, адбудуцца сумесныя фестывалі і конкурсы. Запланавана развіццё праектаў з выкарыстаннем мультымедыйных сродкаў і тэхналогій дыстанцыйнага навучання.

Што да культурнага ўзаемадзеяння, то ў праграме — правядзенне Дзён культуры, мастацкіх фестываляў, выставак. Гарады абменяюцца інфармацыяй аб святкаваннях памятных дат і іншых значных падзей. Будуць устаноўлены прамыя кантакты паміж тэатральна-канцэртнымі арганізацыямі Мінска і Ташкента, пройдуць гастролі творчых калектываў, тэатральных груп.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ И ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор торгов: антикризисный управляющий – Исакова Татьяна Юрьевна (029) 892-40-22

Продавец: ОАО «Витебский комбинат шелковых тканей», 210002, г. Витебск, ул. Максима Горького, 62, (029) 892-40-22, (0212) 34-09-43

Наименование объекта, начальная цена, задаток
Лот № 1. Вал обрезиненный б/у длиной до 1,5 м, 16 шт. Нач.цена: 216,00 бел. руб. без НДС. Задаток: 21,60 бел. руб.
Лоты №2–41. Литье чугунное, болванки, 250 кг. Начальная цена за 1 лот: 337,50 бел. руб. без НДС. Задаток за 1 лот: 33,75 бел. руб.
Лот № 42. Геосетка артикул SL50/25, размер ячеек 25х25 мм, пропитка ПВХ, ширина 250 см, вес 1 пог. м. – 750 г, всего 2567,0 пог. м. Нач. цена: 12 706,65 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 270,67 бел. руб.
Лот № 43. Геосетка артикул SL50/30, размер ячеек 30х30 мм, пропитка ПВХ, ширина 265 см, вес 1 пог. м. – 670 г, всего 22,0 пог. м. Нач. цена: 108,90 бел. руб. без НДС. Задаток: 10,89 бел. руб.
Лот № 44. Геосетка артикул 12С11ВШ, рис. 3, размер ячеек 10х10, пропитка ПВХ, ширина 250 см, вес 1 пог. м. – 1612 г, всего 264,0 пог. м. Нач. цена: 1 217,04 бел. руб. без НДС. Задаток: 121,70 бел. руб.
Лот № 45. Геосетка артикул 12С12ВШ, рис. 4, размер ячеек 40х40, пропитка ПВХ, ширина 284 см, вес 1 пог. м. – 1189 г, всего 50,0 пог. м. Нач. цена: 165,50 бел.руб. без НДС. Задаток: 16,55 бел. руб.
Повторные торги состоятся 03.09.2019 в 13.00 по адресу: г. Витебск, ул. Максима Горького, 62, в ОАО «Витебский комбинат шелковых тканей». Срок внесения задатков и подачи заявлений на участие в торгах: с 02.08.2019 по 30.08.2019 с 9.00 до 16.00. Шаг аукциона устанавливается в сумме 5 % от начальной цены лота в белорусских рублях. **Условия:** оплата НДС сверх цены продажи имущества в соответствии с налоговым законодательством Республики Беларусь. Ранее опубликованные извещения: газета «Звязда» 29.10.2018, 02.04.2019

Наименование объекта, начальная цена, задаток
Лот № 1. Мостовой кран – 5 т, инв. № 142263-1. Нач. цена: 1000,00 бел. руб. без НДС. Задаток: 100,00 бел. руб.
Торги состоятся 03.09.2019 в 13.00 по адресу: г. Витебск, ул. Максима Горького, 62, в ОАО «Витебский комбинат шелковых тканей». Срок внесения задатков и подачи заявлений на участие в торгах: с 02.08.2019 по 30.08.2019 с 9.00 до 16.00. Шаг аукциона устанавливается в сумме 5% от начальной цены лота в белорусских рублях. Условия: оплата НДС сверх цены продажи имущества в соответствии с налоговым законодательством Республики Беларусь

Задаток перечисляется: р/с № BY70LBBB30120300008252501001 (бел. руб.); BY43LBBB30120300008252501002 (USD); BY16LBBB30120300008252501003 (EUR); BY86LBBB30120300008252501004 (RUB) в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Витебской обл., BIC BLBBBY2X, УНН 300082525. Получатель платежа: ОАО «Витебский комбинат шелковых тканей». Задаток за участие в аукционе резидентами Республики Беларусь перечисляется в белорусских рублях, нерезидентами – в белорусских рублях или в иностранной валюте с применением официального курса Национального банка Республики Беларусь на день платежа. В случае перечисления денежных средств в иностранной валюте, комиссия по конвертации и переводу валюты осуществляется за счет покупателя. Заявления на участие в торгах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 9.00 до 16.00 по адресу: г. Витебск, ул. М. Горького, 62 в ОАО «Витебский комбинат шелковых тканей». Торги проводятся в соответствии с Законом Республики Беларусь от 13 июля 2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 5 дней со дня проведения торгов возместить затраты на организацию и проведение торгов, затраты по оценке имущества, изготовлению документации, необходимой для проведения торгов; в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов подписать договор купли-продажи; оплатить предмет торгов и НДС в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи. Имущество считается проданным лицу, которое предложило на торгах самую высокую цену. В случае если торги признаны несостоявшимися, предмет торгов продается единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (либо явившемуся для участия в них) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов не позднее, чем за 5 дней до даты их проведения. Ознакомление с имуществом осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00. Объекты находятся по адресу: г. Витебск, ул. Максима Горького, 62. Имущество, выставляемое на торги, по лотам №1 бывшее в употреблении; по лотам №2-45 новое. Контактный телефон (029) 892-40-22, (0212) 34-09-43, т/факс: (0212) 34-36-54, e-mail: silkvitebsk@yandex.by

«Уважаемые акционеры ОАО «Белхим»!
16 августа 2019 г. в 14.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Белхим», расположенного по адресу: г. Минск, ул. Короля, д. 34.
Собрание пройдет по адресу: г. Минск, ул. Короля, 34 (зал переговоров)».

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:
1. О выплате дивидендов по итогам работы ОАО «Белхим» за первое полугодие 2019 года.
С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Короля, 34 с 06.08.2019 по 15.08.2019 (понедельник–пятница с 9.00 до 14.00) либо 16.08.2019 по месту проведения собрания.
Список лиц, имеющих право на участие в собрании, будет составлен по состоянию на 05.08.2019.
Регистрация участников собрания 16 августа 2019 г. с 13.00 до 14.00 по месту проведения собрания.
Начало работы собрания – 16 августа 2019 г. в 14.00.
Для регистрации при себе иметь документы, удостоверяющие личность (паспорт).

УНП 100122846

РУП «Институт недвижимости и оценки» (организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Строительный трест № 21» (Продавец), находящегося в г. Борисов, ул. Чапаева, 82

Лот №1: административное помещение, инв. № 610/D-54569, площадь 932,9 кв. м, 1983 г. п. **Начальная цена** с НДС – 376 128,37 бел. руб. Задаток – 37 612,83 бел. руб. Лот № 2: административное помещение, инв. № 610/D-54571, площадь 936,3 кв. м, 1983 г. п. Начальная цена с НДС – 377 499,20 бел. руб. **Задаток** – 37 749,92 бел. руб.

Аукцион состоится 28.08.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4. Шаг аукциона – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе **28.08.2019.** Лица, желающие участвовать в торгах по нескольким Лотам, вносят задаток, установленный для каждого из Лотов. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 26.08.2019 в 11.00. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 26.02.2019

Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 www.ino.by e-mail: torgi@ino.by

ЭКАНОМІКА І РЭГІЁНЫ

Ад Гродна да Ташкента

Напярэдадні І Форуму рэгіёнаў Беларусі і Узбекістана дэлегацыя дзелавых колаў Прынёмання наведала гарады цэнтральнаазіяцкай краіны

Па выніках візіту ў рамках форуму падпісана пагадненне паміж Гродзенскім аблвыканкамам і хакімiятамі Самаркандскай і Андыжанскай абласцей Узбекістана аб супрацоўніцтве ў гандлёва-эканамічнай, навукова-тэхнічнай і гуманітарнай сферах.

Фота прадастаўлена «Гродзенскай праўдай».

Прадстаўнікі мясцовых улад, кіраўнікі кампаній і бізнес-колаў на чале з намеснікам Гродзенскага аблвыканкама Аленай Бубенчык пабывалі ў Ташкенце і Самаркандзе — вузлавых цэнтрах Узбекістана. Падчас сустрэчы ў Ташкенце з саветнікам прэм'ер-міністра Рэспублікі Узбекістан Надзірам Атажонавым былі абмеркаваны перспектыўныя кірункі супрацоўніцтва, у прыватнасці каапэрацыя ў лёгкай і харчовай прамысловасці, а таксама сумесная работа па выпуску сельгастэхнікі. Дарэчы, важнае значэнне надавалася менавіта супрацоўніцтву ў галіне лёгкай прамысловасці. Вялася размова са старшынёй асацыяцыі «Узтэкстыльпрам» Ільхомам Хайдаравым аб пашырэнні ўзаемнай дзейнасці ў тэкстыльнай і швейна-трыкатажнай вытворчасці.

У пасольстве Беларусі ва Узбекістане была арганізавана сустрэча з дзелавымі коламі. Гродзенцы перш за ўсё рабілі акцэнт на канкрэтныя праекты і пошук новых партнёраў.

Ёсць падставы развіваць і міжрэгіянальныя адносіны. Узбекістан і Гродзенская вобласць маюць трывалыя стасункі з Сурхандар'інскай вобласцю і Рэспублікай Каракалпакстан Рэспублікі Узбекістан, з якімі падпісаны мемарандумы аб супрацоўніцтве.

Для пашырэння сувязяў гродзенская дэлегацыя наведала старажытны Самарканд, дзе адбылася сустрэча з кіраўніцтвам вобласці. Гродзенцы пабывалі на буйных аб'ектах рэгіёна — тэкстыльнай і малочнай фабрыках, а таксама на аўтамабільным заводзе, дзе таксама правялі перагаворы.

Узбекскі бок зацікавіла прапанова беларускай дэлегацыі аб стварэнні ў Гродзенскай вобласці сумеснага прадпрыемства па выпуску сельгастэхнікі, адаптаванай да работы ў Цэнтральнай Азіі. Таксама была падтрымана ідэя па арганізацыі сеткі дыстрыб'ютараў па збыце лакафарбавай прадукцыі, вырабаў шклозавода «Неман», сухіх малочных сумясяў. Ёсць перспектывы ў Слонімскага мясакамбіната, які адзіны ў вобласці мае сертыфікат «халяль», што дазваляе выходзіць на рынкі мусульманскіх краін.

Дасягнуты і канкрэтныя пагадненні. Так, вырашана арганізаваць курсы для ўрачоў на базе клінік. Таксама ўзбекскія спецыялісты-жывёлаводы будуць вывучаць тэхналогіі работы на малочнатаварных фермах рэгіёна, для гэтай мэты ў Гродзенскай вобласці вызначаць дзесяць такіх аб'ектаў. Ёсць дагаворы ў сферы турызму. Паміж Узбекістанам і гродзенскім рэгіёнам будзе падрыхтаваны праект супрацоўніцтва і графік наведвання тураператарамі абедзвюх краін.

Распарацавана дарожная карта па рэалізацыі пагаднення паміж Гродзенскай і Самаркандскай абласцямі, якая падпісана падчас візіту ўзбекскай дэлегацыі ў гродзенскі рэгіён.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

У тэму

Гандлёвы абарот паміж Гродзенскай вобласцю і Узбекістанам за мінулы год вырас на 45 % і склаў 15,5 мільёна долараў. Гродзенцы пастаўляюць як прамысловую, так і харчовую прадукцыю. На тэрыторыі рэгіёна працуе амаль 30 арганізацый з узбекскім капіталам. Адным з важных праектаў з'яўляецца стварэнне вертыкальна інтэграванага комплексу па вытворчасці баваўнянай пражы і вырабаў з яе.

Актыўна супрацоўнічаюць з узбекскімі ВНУ гродзенскія ўніверсітэты. У чэрвені падпісана пагадненне аб стварэнні сумеснага факультэта па падрыхтоўцы спецыялістаў паміж Гродзенскім дзяржаўным аграрным універсітэтам і Самаркандскім інстытутам ветэрынарнай медыцыны. Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы вядзе сумесную работу па праектаванні, будаўніцтве і эксплуатацыі дарог. Ёсць праекты па вывучэнні раслін на забруджаных цяжкімі металамі глебах.

СУПРАЦОЎНІЦТВА БЕЗ МЕЖАЎ

СУМЕСНЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ І АБМЕН ВОПЫТАМ

Што звязвае Міншчыну і Узбекістан

Больш як сорак прадстаўнікоў цэнтральнага рэгіёна прыняло ўдзел у І Форуме рэгіёнаў Беларусі і Узбекістана.

Падчас пленарнага пасяджэння намеснік старшыні Мінаблвыканкама Мікалай Рагашчук расказаў аб міжрэгіянальных сувязях Міншчыны і Рэспублікі Узбекістан. Таксама было падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве ў сацыяльнай сферы паміж Мінскім абласным выканаўчым камітэтам і хакімiятам Ташкенцкай вобласці. Паводле яго, бакі будуць абменьвацца вопытам і вучэбна-метадычнай дакументацыяй па арганізацыі навучальнага працэсу ва ўстановах адукацыі, праводзіць сумесныя канферэнцыі і семінары. Асаблівая ўвага — узаемадзеянню ў сферы аховы здароўя, абмену вопытам і павышэнню кваліфікацыі ўрачоў.

Бакі ўзялі на сябе абавязацельствы прымаць узгодненыя меры па стварэнні спрыяльных умоў для развіцця і ўмацавання кантактаў у сферы культуры, спорту і турызму. Тэрмін дзеяння пагаднення пяць гадоў.

Сапраўды, Міншчыну і Узбекістан звязвае цеснае сяброўства. Толькі летась узбекская дэлегацыя чатыры разы наведвала цэнтральны рэгіён. Беларусы двойчы здзейснілі візіты ў адказ, вынікам якіх сталі тры дакументы, што рэгламентуюць міжрэгіянальнае супрацоўніцтва. Падчас сустрэчы, якая адбылася ў красавіку гэтага года ў Мінаблвыканкаме, падпісаны дагавор аб стварэнні сумеснага прадпрыемства, яго заснавальнікам з беларускага боку стала адкрытае акцыянернае таварыства «Здравушкамілк».

Вынікам рэалізацыі двухбаковых дамоў стаў значны рост экспарту тавараў вытворцаў Мінскай вобласці на Узбекістан. Калі ў 2018 годзе экспарт склаў 12,8 мільёна долараў, то сёлета толькі за чатыры месяцы — 10 мільёнаў. На Узбекістан экспартуюцца ў асноўным мяса і харчовыя субпрадукты з птушкі, прадукты перапрацоўкі нафты і медыцынскія прыборы. Імпартавала Міншчына баваўняную пражу, трыкатажнае палатно, свежы і сушаны вінаград.

Дададзім, што паміж Мінскай і Ташкенцкай абласцямі актыўна развіваецца супрацоўніцтва ў гуманітарнай сферы. Напрыклад, Мінскі абласны краязнаўчы музей мае праекты з Дзяржаўным музеем гісторыі Узбекістана.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ БАНК
BELARUSKY NARODNY BANK

ОАО «БНБ-Банк»

220012, Республика Беларусь, г. Минск, проспект Независимости, 87а

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2019 г.

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Сим-вол	01.07.2019	01.01.2019
1	2	3	4	5
1	АКТИВЫ			
2	Денежные средства	1101	9 674	11 213
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	-	-
4	Средства в Национальном банке	1103	45 467	46 357
5	Средства в банках	1104	24 400	47 980
6	Ценные бумаги	1105	100 398	55 086
7	Кредиты клиентам	1106	354 555	344 904
8	Производные финансовые активы	1107	2 375	4 538
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	306	137
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	18 648	18 289
11	Доходные вложения в материальные активы	1110	10 220	7 026
12	Имущество, предназначенное для продажи	1111	3 961	8 691
13	Отложенные налоговые активы	1112	3	288
14	Прочие активы	1113	3 737	4 907
15	ИТОГО активы	11	573 744	549 416
16	ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
17	Средства Национального банка	1201	-	-
18	Средства банков	1202	49 780	65 485
19	Средства клиентов	1203	411 846	378 820
20	Ценные бумаги банка	1204	34 720	30 732
21	Производные финансовые обязательства	1205	7	-
22	Отложенные налоговые обязательства	1206	-	
23	Прочие обязательства	1207	2 150	2 543
24	ВСЕГО обязательства	120	498 503	477 580
25	СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
26	Уставный фонд	1211	27 688	27 688
27	Эмиссионный доход	1212	-	-
28	Резервный фонд	1213	7 153	6 400
29	Фонды переоценки статей баланса	1214	12 247	12 392
30	Накопленная прибыль	1215	28 153	25 356
31	ВСЕГО собственный капитал	121	75 241	71 836
32	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12	573 744	549 416

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 июля 2019 г.

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Сим-вол	01.07.2019	01.07.2018
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	19 294	16 247
2	Процентные расходы	2012	10 611	7 189
3	Чистые процентные доходы	201	8 683	9 058
4	Комиссионные доходы	2021	7 082	5 538
5	Комиссионные расходы	2022	1 491	2 213
6	Чистые комиссионные доходы	202	5 591	3 325
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	(176)	(55)
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	4 077	2 807
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	1 851	2 974
11	Чистые отчисления в резервы	207	1 039	701
12	Прочие доходы	208	3 737	3 448
13	Операционные расходы	209	16 311	15 111
14	Прочие расходы	210	1 007	788
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	5 406	4 957
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212	893	1 416
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	4 513	3 541

Заместитель Генерального директора С. К. Сабук

Главный бухгалтер Н. П. Шнип

Дата подписания: 18 июля 2019 г.

Данная отчетность размещена на странице интернет-сайта БНБ-Банка: **https://www.bnb.by/o-nas/nashi-rezultaty/bukhgalterskaya-otchetnost/**

Открытое акционерное общество «Белорусский народный банк»
Лицензия на осуществление банковской деятельности, выданная Национальным банком Республики Беларусь, № 10 от 11 мая 2019 г.
УНП 100513485.

Государственное предприятие «МГЦН» сообщает о внесении следующего дополнения в извещение о проведении 2 сентября 2019 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 7» (опубликовано в газете «Звязда» 31.07.2019): «Местонахождение продаваемого имущества: Минская обл., Березинский р-н, Поплавский сельсовет».
Телефон для справок: +375 (17) 327 48 36.
Адрес в сети интернет: www.mgcn.by.

УНП 190398583

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч. Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.,** намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.,** намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.,** старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.,** старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.,** старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 287 18 31;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 1 жніўня 2019 года.